Работніца і Калгасьніца Беларусі



N·11 (156)
1932

САМЫ БОЛЬШЫ Ў СЬВЕЦЕ ЗАВОД „ШАРЫКА-ПАДШЫПНІК“ УСТУПІЎ У СТРОЙ

29-га сакавіка ўступіла ў строй першая чарга сусьветнага гіганта „Шарыкападшыпніка“.

Завод будзе выпускаць у год 24 мільёны падшыпнікаў, прычым прадугледжана павялічэньне гэтай лічбы да 36 мільёнаў, у той час, як 15 заводаў усяго сьвету выпускаюць зараз 36 мільёнаў падшыпнікаў. Па сваёй велічыні і высокім тэхнічным абсталяваньні ён перагнаў самы большы ў сьвеце амэрыканскі падшыпнікавы завод, які ў два разы меншы за наш завод. Усе заводы Эўропы даюць штодзенна 120.000 падшыпнікаў. Маскоўскі завод будзе штодзённа даваць 100 000 падшыпнікаў. Гэта апошняе слова сусьветнай тэхнікі. Зараз на заводзе працуе 5 000 рабочых і служачых, а будзе працаваць 15.000. Разам з заводам пабудован рабочы пасёлак.

Тры карпусы пабудаваны, шэсьць заканчваюцца пабудовай, будуецца пасёлак стандартных дамоў, фабрыка-кухня. Будуць пабудаваны тэатр, універмаг, кіно, клюб, школы, дзіцячыя ясьлі, амбулятоpыя і г. д.

У 1932 годзе завод павінен даць 3 мільёны высокаякасных савецкіх падшыпнікаў для заводаў Сталінградзкага, Харкаўскага, „Чырвонага путілаўца“.



Агульны выгляд першых коксавых батарэй у Магнітагорску.

Савецкі шарыкавы і ролікавы падшыпнік—вялікая перамога на шляху індустрыялізацыі краіны і ўмацаваньня яе тэхніка-эканамічнай незалежнасьці.

Гэта вялізарная перамога яшчэ раз сьведчыць аб правільнасьці генэральнай лініі нашай партыі і яе ленінскага ЦК.

Лёзунг „дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны“ ператвараецца ў жыцьцё. Першы падшыпнікавы завод імя тав. Кагановіча—новы ўклад у будынак сацыялізму.

А.

Запалена першая кузьнецкая домна

Кузьнецкая домна № 1, у аб'ёме 826 кубамэтраў, запалена першага красавіка. Па сваёй магутнасьці яна ўступае толькі Магнітагорскай. Домна пабудавана паводле апошняга слова тэхнікі.

Усе працэсы працы мэханізаваны. Зараз будуюцца два руднікі. У гэтым годзе ў Кузьнецку будуць пушчаны яшчэ тры доменныя печы. Домна № 2, такога-ж аб'ёму як і домна № 1, будзе запалена ў маі.

Ідзе мантаж аднаго з вялізарнейшых у сьвеце блюмінгаў магутнасьцю у 1.200 тысяч тон пракату ў год.

Вось бальшавіцкае выкананьне пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) аб тым, каб зрабіць другую мэталюргічную базу на Ўсходзе.

Пралетарыят Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, і надалей будзе ісьці ад перамог да перамог на фронце пабудовы новага бясклясавага грамадзтва.

Г.

Домна-унікум

1-га лютага першая Магнітагорская домна дала плаўку чыгуну ў 24 тоны. 28 га сакавіка яна дала 1.037 т. ліцейнага чыгуну вышэйшай якасьці—маркі „О“.

Аб'ём печы—1.180 куб. мэтраў. Такіх печаў на было ніколі ні ў нас, ні ў Заходняй Эўропе. У Амэрыцы ёсьць толькі адзінкі.

1.037 тон ліцейнага чыгуну зьяўляецца буйнай перамогай пралетарыяту ў галіне аўладаньня перадавой у сьвеце тэхнікай.

Першая Магнітагорская домна, якая стаіць на рубяжы Эўропы і Азіі, зьяўляецца новым умацаваньнем тэхніка эканамічнай незалежнасьці і абароназдольнасьці нашай краіны.

К.

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ

КРАСАВІК 1932 год **8-мы год выданьня** **№ 11 (156)**

„Трэцяя бальшавіцкая вясна павінна прайсьці пад знакам барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за агратэхніку, укараненьне севазвароту, за высокую якасьць апрацоўкі глебы, барацьбы са стратамі, узорнай арганізацыі ўборкі, што зьяўляецца сустаўной часткай арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і якаснага павышэньня калгаснай вытворчасьці“ (з паст. аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Па-ўдарнаму правесьці бальшавіцкую вясну

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які нядаўна адбыўся, абгаварыў пытаньне аб правядзеньні веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі 1932 г.

„Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б прызнае становішча з падрыхтоўкай да сяўбы і ход выкананьня дырэктыў аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў нездавальняючым і паказвае, што падрыхтоўка і правядзеньне 3-яй бальшавіцкай сяўбы зьяўляюцца зараз асноўнай важнейшай задачай усёй КП(б)Б, якая (задача) зьвязана з выкананьнем пляну 4-га, заключнага году пяцігодкі“.

На 20 сакавіка па БССР ссыпана ўсяго 64,19 пр. насенфондаў, з якіх тэхнічных—46,3 проц., страхфондаў у калгасах—52,9 проц., у аднаасобнікаў—11,2 проц. Рамонт па ўсіх сельска-гаспадарчых сыстэмах выканан: па трактарах—на 69,9 проц., трактарных плугох—на 64,7 проц., конных плугоў — на 61 проц., сявярках — на 70,5 проц., калёсах—на 41,6 проц. Плян падрыхтоўкі кадраў масавай кваліфікацыі выканан толькі на 40 проц., у тым ліку па трактарыстах-рулявых—58 проц., брыгадзірах па ільне і каноплях—14,4 проц.

Пленум адзначыў „зусім нездавальняючы ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў аднаасобным сэктары“.

Такое становішча зьяўляецца вынікам слаба разгорнутай масавай работы і канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва ходам падрыхтоўкі да веснавой сяўбы з боку партыйных, савецкіх і зямельна-калгасных арганізацый, якія ў большасьці раёнаў не перабудавалі сваёй працы згодна пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Партыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя арганізацыі павінны цэнтр цяжару падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі перанесьці на арганізацыю вытворчых брыгад з пастаянным складам калгасьнікаў і калгасьніц. Да брыгад павінны быць прымацаваны пэўныя вучасткі, сельска-гаспадарчы інвэнтар і цягавая сіла. У адпаведнасьці з вытворчым планам брыгады павінна быць выдзелена ім патрэбная колькасьць насеньня. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на падбор, вылучэньне і падрыхтоўку брыгадзіраў са складу ўдарнікаў і калгасьніц. Неабходна таксама наладзіць і разгарнуць работу вытворчых нарад у калгасах.

Шляхам арганізацыі міжраённай і міжкалгаснай узаемадапамогі, рэалізацыі насеннай пазыкі і арганізацыі буксірных брыгад дабіцца поўнага забесьпячэньня засеву намечанай плошчы і стварэньня страхавых фондаў за кошт мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў. „Пленум папярэджвае, што стварэньне насенных і страхавых фондаў зьяўляецца асноўнай задачай падрыхтоўкі да сяўбы, ад пасьпяховага выкананьня якое будзе залежаць выкананьне плянаў сяўбы“.

У кожным калгасе павінны быць створаны належныя фуражныя фонды. Неабходна разгарнуць узаемадапамогу па кармовых рэсурсах на час правядзеньня сяўбы і эканомію ў выдаткаваньні іх.

Кулацкая агітацыя за разбазарваньне коняй і фуражных фондаў павінна атрымаць самы рашучы адпор.

У некаторых раёнах наглядаюцца імкненьні зьменшыць пасевы вядучых культур за кошт спажывецкіх. Неабходна рашуча змагацца з такімі спажывецкімі настроямі. „Павінна быць разгорнута самая бязьлітасная барацьба з імкненьнямі скараціць пляны, асабліва за кошт тэхнічных культур і асваеньня новых земляў, з самацёкам у мабілізацыі другарадных культур“.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на правядзеньне мерапрыемстваў па ўздыме ўраджайнасьці, на ўкараненьне агратэхнікі. Вельмі важнае значэньне ў справе барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці мае правядзеньне раньняй сяўбы, якая павінна быць скончана ў найбольш скарочаны тэрмін (на працягу мая месяца).

Неабходна забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў засеву кармовых траў і сіласаваньня і пасьпяховага правядзеньня ўборачнай, чым будзе створана ў 1932 годзе ўласная кармовая база для разьвіцьця соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

На аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў дабіцца завяршэньня ў асноўным суцэльнай калектывізацыі БССР у 1932—1933 годзе.

У часе веснавой сяўбы будуць працаваць на калгасных палёх 57 МТС, якія „павінны паставіць

Канец глядзі на 2-ой старонцы зьнізу.

Дэлегаткі калгасу Дзяржынскага ўзялі на буксір калгас „13-годзьдзе Кастрычніка"

(Заслаўскі раён)

Калгас імя Дзяржынскага поўнасьцю гатоў да сяўбы. Насенныя фонды ссыпаны і ачышчаны. Ссыпана бульбы 2.125 *цнт*, ячменю—152 *цнт*, аўса—380 *цнт* і г. д. Асабліва актыўны ўдзел прымалі жанчыны ў ссыпцы насеньня гародніны. Па пачыне дэлегацкага сходу ў кожнай вёсцы былі створаны брыгады, якія шляхам падворнага абходу калгасьнікаў сабралі 4 пуды насеньня гародніны, што забясьпечвае ўсю плошчу гароду насеньнем. Плугі ў ліку 69 штук адрамантаваны, таксама 105 баран, 25 акучнікаў і інш. Завезена мінэральнага ўгнаеньня 20 *т*.

Актыўны ўдзел прымаюць жанчыны ў зборы попелу. Пастанова агульнага сходу жанчын аб тым, што ўвесь попел павінен быць на полі, строга выконваецца. Па брыгадзе № 2 жанчыны самі сабралі ўжо попел, а астатнія жанчыны падрыхтоўваюць яго і здаюць вучням, якія зьбіраюць.

Дэлегацкі сход калгасу налічвае 35 дэлегатак. Неабходна адзначыць сапраўды ўдарную работу сходу ў масе жанчын калгасу, на чале з кіраўніком дэлегацкага сходу тав. Юрэнка (старшыня калгасу) і настаўніцы тав. Бабіч. Праведзена 12 сходаў жанчын па пытаньні веснавой сяўбы. Гэта дало вельмі дадатныя вынікі. Арганізаваны выключна жаночыя брыгады па вывазцы гною, якія добра спраўляюцца са сваёй працай. Заключаны сацумовы паміж брыгадамі. Брыгады жанчын выклікаюць брыгады мужчын на сацспаборніцтва.

Дэлегацкі сход і наогул жанчыны правільна ўлічылі ролю каня ў калгасе, неабходнасьць яго добраякаснага ўтрыманьня. Для гэтага былі створаны спэцыяльныя брыгады жанчын, якія ўночы рабілі налёты на стайні, правяралі, як даглядаюцца коні і маладняк. Брыгады выявілі ў некаторых пунктах шмат агідных адносін да коняй. Напрыклад, у брыгадзе № 4 конюхі Міцкевіч і Ціхановіч нядбайна (па-шкодніцку) адносіліся да сваёй працы, але праўленьне зараз-жа прыняло меры і аддало іх пад суд. Брыгада адзначыла добрую работу ўдарніцы Зубкоўскай, конюха Вашкевіча і Адынец па доглядзе жывёлы, якіх прадставілі для прэміяваньня, а конюхам Міцкевічу і Ціхановічу брыгада прапанавала даць рагожныя сьцягі і акуляры, каб яны лепш бачылі, гэтыя акуляры ўжо заказаны ў дзіцячай майстэрні. Іры актыўнай дапамозе дэлегатак ліквідуюцца апошнія рэшткі абязьлічкі ў доглядзе жывёлы. Так змагаюцца жанчыны за ахаваньне цягавай сілы ў калгасе.

Шырокую палітычна-выхаваўчую работу праводзіць ударніца-настаўніца тав. Бабіч. Зараз ужо на сходах жанчын тав. Бабіч прапрацоўвае пытаньне антывялікоднай кампаніі, што мае вялікае выхаваўчае значэньне.

Для поўнага забесьпячэньня калгасу рабочай сілай будуць адчынены на тэрыторыі калгасу 4 ясьлі і 2 пляцоўкі, кадры для дзіцячых устаноў ужо падрыхтаваны. Калгасьніцы актыўна наведваюць лікпункт, а да тых, хто з дзецьмі, прымацаваны вучні старэйшых клясаў школы.

Падрыхтаванасьць калгасу да вясны—вынік бальшавіцкай работы, якая была праведзена і якая зараз праводзіцца сярод калгасьніц.

Абмеркаваўшы пытаньне падрыхтоўкі да сяўбы на агульным сходзе, жанчыны, выдзелілі буксірную брыгаду з ліку лепшых ударніц—тав. Бабіч Марыі, Зубкоўскай Марылі, Жукоўскай Марылі, Грыб Марылі, Мароз Тацьцяны, Грычынай Ганны, якая ў нядзелю (28) выяжджае для практычнай дапамогі калгасу „13-годзьдзе Кастрычніка" ў падрыхтоўцы да 3-яй бальшавіцкай вясны.

Прыклады працы калгасу імя Дзяржынскага неабходна перанесьці ва ўсе калгасы БССР.

Куніна.

ПА-ЎДАРНАМУ ПРАВЕСЬЦІ БАЛЬШАВІЦКУЮ ВЯСНУ *Канец*

у цэнтры сваёй увагі барацьбу за якасьць сельска-гаспадарчай вытворчасьці і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў". Саўгасы, якіх налічваецца ў БССР 332 з пасеўнай плошчай у 240 тыс. *га*, павінны ў веснавой сяўбе „стаць авангардам у барацьбе за высокі ўраджай, за новую сацыялістычную культуру зямляробства".

Шляхам шырока разгорнутай масавай работы неабходна дабіцца выкананьня аднаасобным сэктарам вытворчых плянаў і правядзеньня аграмерапрыемстваў.

Поўнае выкананьне ўсіх плянаў 3-яй бальшавіцкай вясны патрабуюць мабілізацыі самых шырокіх мас калгасьнікаў, калгасьніц, саўгасьнікаў, саўгасьніц, аднаасобнікаў.

Дэлегацкія сходы павінны паказаць прыклад узорнай работы па правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў па веснавой сяўбе, арганізоўваць ударныя брыгады імя 3-яй бальшавіцкай вясны, буксіры, гурткі агратэхнікі і інш.

Працоўныя жанчыны вёскі павінны дабіцца сваячасовага разгортваньня сеткі бытавых устаноў (ясьляй, пляцовак і інш.), каб забясьпечыць 100-проц. выхад жанчын на работу.

Пленум абавязаў Наркамаховы Здароўя, Наркамасьветы, ГК і РК забясьпечыць не пазьней 5 мая разгортваньне вызначанай сеткі дзіцячых пляцовак, ясьляй і інш. бытавых устаноў.

Сваячасова таксама павінна быць наладжана грамадзкае харчаваньне на час пасеўнай.

Вялікую ролю ў справе правядзеньня веснавой сяўбы павінны адыграць арганізацыі, якія шэфствуюць над вёскай. Задача рабочых і работніц—перадаць калгасам свой лепшы вопыт у справе арганізацыі працы, дапамагчы ім у правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў па веснавой сяўбе.

У часе 3-яй бальшавіцкай вясны павінен быць забясьпечан пасеў 40 тысяч *га* каапэрацыйнымі прыгарадным гаспадаркамі.

Работніцы, калгасьніцы, працоўныя жанчыны павінны цьвёрда памятаць, што „задачы трэцяй бальшавіцкай вясны могуць быць выкананы толькі пры ўмове рашучай ачысткі калгасаў ад кулацка-варожых элемэнтаў, у барацьбе з агентурай клясавага ворага—правымі і „левымі" апартуністамі і з прымірэнцтвам да ўхілаў ад лініі партыі".

Пастанову ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка—у шырокія масы калгасьніц і аднаасобніц—бяднячак і сераднячак

Асноўнай задачай калгаснага будаўніцтва на даным этапе зьяўляецца далейшае разьвіцьцё і ўмацаваньне арцельнай формы калгасаў. У пастановах ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў з асаблівай выразнасьцю падкрэсьлена, што арцельная форма калгасаў яшчэ належна не разгорнута і не ўмацавана.

Ня гледзячы на гэта, мы маем у радзе раёнаў і паасобных калгасах „лявацкія" загібы, спробы пераскочыць праз арцельную форму. Паасобныя парт'ячэйкі Барысаўскага раёну практыкуюць простую ліквідацыю сельска-гаспадарчых арцеляй шляхам прымусовага іх далучэньня да саўгасаў. „Лявацкі" заскок праявіла Зэмбінская парт'ячэйка, якая прапанавала старшыні калгасу „Савецкая Каменка" аграмадзіць усю жывёлу калгасьнікаў, ня ўлічваючы жаданьня самих калгасьнікаў.

Такія выпадкі прымусовага аграмаджаньня жывёлы ёсьць ня толькі ў практыцы Зэмбінскай арганізацыі, але і ў радзе іншых.

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка гаворыць, што „практыка прымусовага адабраньня ў калгасьніка каровы і дробнай жывёлы ня мае нічога агульнага з палітыкай партыі". І далей у пастанове з усёй рашучасьцю падкрэсьліваецца, што „толькі ворагі калгасаў могуць дапусьціць прымусовае аграмаджаньне кароў і дробнай жывёлы ў паасобных калгасьнікаў".

Такія „лявацкія" загібы граюць на руку нашаму клясаваму ворагу—кулаку. Спробы адміністраваньня ў справе аграмаджаньня апошняй каровы калгасьніка і дробнай жывёлы гавораць аб апартуністычным жаданьні адмахнуцца ад цяжкай задачы перавыхаваньня калгасьнікаў.

Трэба ведаць, што ліквідацыя індывідуальнай маемасьці калгасьніка на сёнешні дзень азначала-б, што калгас павінен быў-бы заняцца справай спажывецкага забесьпячэньня калгасьнікаў, замест арганізацыі калгаснай вытворчасьці. І таму ў сваёй пастанове ад 26 сакавіка ЦК УсеКП(б) растлумачыў, што „задача партыі заключаецца ў тым, каб у кожнага калгасьніка была свая карова, дробная жывёла і птушка" для задавальненьня асабістых патрэб калгасьнікаў, што павінна быць арганізавана дапамога калгасьнікам, якія ня маюць уласнай каровы, у набыцьці каровы ці маладняка для гадоўлі.

Партыя і савецкая ўлада ў асноўным вырашыла збожжавую праблему і таму разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі паставіла, як цэнтральную задачу на даным этапе. Але нідзе ў пастановах партыі і ўраду ня сказана, што праблему сацыялістычнай жывёлагадоўлі можна вырашаць шляхам адміністраваньня, шляхам прымусовага аграмаджаньня жывёлы. Правільны шлях, які ўказвае партыя (пастанова ЦК ад 26 сакавіка), што „далейшае пашырэньне і разьвіцьцё калгасных фэрм павінна ісьці толькі шляхам гадоўлі фэрмамі маладняка, ці куплі імі жывёлы".

У пастанове ЦК КП(б)Б ад 3-га красавіка адзначана, што „ў асобных раёнах маюць месцы імкненьні кулацкіх элемэнтаў выкарыстаць дапушчаныя перагібы і памылкі для расьцягваньня калгасных таварных фэрм, там, дзе аграмаджаньне было праведзена на аснове статуту сельска-гаспадарчай арцелі, поўнай добраахотнасьці".

На мясцох трэба пільна сачыць і выкрываць падобныя кулацкія спробы, шырока папулярызуючы пастанову ЦК УсеКП(б) ад 26-га сакавіка.

Для таго, каб фэрма ўмацоўвалася і расла, павінна быць складзена моцная кармовая база. У часе ажыцьцяўленьня плянаў веснавой пасеўнай, трэба вялікую ўвагу зьвярнуць на пасеў кармовых траў і кораньплодаў. Па прыкладзе калгасу „Чырвоны Дырыжабль", Капыльскі р., высуньце свае сустрэчныя пляны засеву гэтых культур з такім разьлікам, каб забясьпечыць поўнасьцю ня толькі калгаснае аграмаджанае стада кармамі, але і жывёлу, якая ёсьць у індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў.

Задача кожнай дэлегаткі, ударніцы-калгасьніцы і актывісткі-аднаасобніцы шырока растлумачыць у калгасных масах і сярод аднаасобніц—бяднячак і сераднячак пастанову ЦК УсеКП(б) ад 26-га сакавіка, якая вядзе да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Дапамажэце на мясцох, у сваіх калгасах, сельсаветах выявіць выпадкі прымусовага аграмаджаньня апошняй каровы калгасьніка і дробнай жывёлы і зараз-жа неадкладна выпраўце гэтыя перагібы.

Дабейцеся дапамогі з боку праўленьняў калгасаў, сельсаветаў тым калгасьнікам, якія ня маюць уласных кароў, набыць іх.

Кандратава.

Брыгада па догляду сьвіней у калгасе імя Чарвякова, Мсьціслаўскі р.

Т.т. Сталін, Молатаў, Калінін і Андрэеў аб значэньні і задачах бюро скаргаў

Работа бюро скаргаў мае вялізарнае значэньне ў справе барацьбы за зьнішчэньне недахопаў нашага партыйна-савецкага, гаспадарча-прафсаюзнага і камсамольскага апаратаў у справе паляпшэньня апарату нашага кіраўніцтва.

Ленін гаварыў, што без апарату мы даўно-б загінулі, а без сыстэматычнай упартай барацьбы за паляпшэньне апарату мы напэўна загінем. Гэта значыць, што рашучая і сыстэматычная барацьба з коснасьцю, бюракратызмам, цяганінай у нашых апаратах зьяўляецца аднэй з істотных задач партыі, рабочай клясы і ўсіх працоўных нашай краіны.

Вялізарнае значэньне бюро скаргаў заключаецца ў тым, што яны зьяўляюцца адным з сур'ёзных сродкаў ажыцьцяўленьня наказу Леніна аб барацьбе за паляпшэньне апарату Бюро скаргаў маюць бясспрэчна значныя дасягненьні ў гэтай галіне і задача заключаецца ў тым, каб замацаваць дасягнутыя рэзультаты і дабіцца рашаючых посьпехаў у гэтай справе. Ня можа быць сумненьня, што бюро скаргаў, згуртоўваючы вакол сябе ўсё больш актыўныя пласты рабочых і калгасьнікаў, уцягваючы іх у справу кіраўніцтва дзяржавай і чула прыслухоўваючыся да голасу працоўных як партыйных, так і беспартыйных,—даб'юцца гэтых рашаючых посьпехаў.

Будзем спадзявацца, што пяцідзеньнік па рабоце бюро скаргаў паслужыць штуршком для далейшага разгортваньня работы бюро скаргаў на шляху, які ўказан нашым настаўнікам—Леніным.

І. СТАЛІН.

* * *

Ленін бязупынна ўказваў на недахопы нашага дзяржапарату, на неабходнасьць упартай барацьбы з бюрократызмам і цяганінай ва ўсіх нашых органах. Партыя вяла і вядзе гэту барацьбу, прыцягваючы масы рабочых і працоўных сялян да справы кіраўніцтва. Але бюрократычных скажэньняў у рабоце нашых органаў настолькі яшчэ многа і зло гэта настолькі яшчэ вялікае, што трэба падзесяцярыць барацьбу з імі, барацьбу за паляпшэньне нашых органаў, за прыцягненьне да іх работы мас рабочых і сялян.

Бюро скаргаў і рабоча-сялянская інспэкцыя ў цэлым могуць шмат чаго зрабіць у справе перамаганьня бюрократызму, у справе зьнішчэньня фактаў бяздушна-чыноўніцкіх адносін да працоўнага з боку нашага дзяржапарату, з боку яго работнікаў, як партыйных, так і беспартыйных. Для гэтага перш за ўсё трэба, каб бюро скаргаў уважліва адносіліся і правяралі паасобныя канкрэтныя факты бюракратызму. Іменна на паасобных канкрэтных прыкладах трэба завастрыць гэту барацьбу. Для гэтага далей трэба, каб праверка гэтых паасобных фактаў ня спынялася на паўдарозе, а абавязкова даводзілася да канца.



Тав. Шаўрына Л. лепшая ўдарніца ф-кі „Клары Цэткін" (г. Віцебск) 4 разы прэміявана.

Няхай усесаюзны пяцідзеньнік па рабоце бюро скаргаў дасьць новы штуршок у справе барацьбы з бюрактычнымі скажэньнямі ва ўсіх нашых органах.

В. МОЛАТАЎ.

* * *

Прыцягненьне працоўных мас да барацьбы з бюракратызмам, цяганінай і іншымі недахопамі ў рабоце савецкага апарату зьяўляецца аднэй з важнейшых форм удзелу ў кіраўніцтве дзяржавай. З гэтага пункту гледжаньня пяцідзеньнік, які праводзіцца ЦК УсеКП(б), НК РСІ і які прысьвечан умацаваньню бюро скаргаў, дасьць нам магчымасьць яшчэ больш глыбока ўкараніць у

сьвядомасьць выказаныя тав. Сталіным думкі аб тым, як трэба ў новай абстаноўцы па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць.

Посьпехі пяцідзеньніка бязумоўна будуць тым больш значнымі, чым больш у непасрэдную работу бюро скаргаў будуць уцягнуты перадавыя актывісты з рабочых і работніц, калгасьнікаў і калгасьніц. На вырашэньні гэтай задачы і трэба завастрыць зараз увагу як партыйных, так і савецкіх органаў на мясцох, а таксама ўвагу цэнтральнай і мясцовай прэсы.

Вельмі важным бокам гэтага пяцідзеньніка зьяўляецца задача—наладзіць правільную пастаноўку работы і саміх бюро скаргаў, што будзе спрыяць яшчэ большаму ўцягненьню ў работу шырокіх рабочых мас. У гэтым пытаньні вялікае значэньне мае падыход да абсьледавацельскай работы, якая праводзіцца бюро скаргаў. Мне прадстаўляецца, што ў абсьледавацельскай рабоце бюро скаргаў першаступовым зьяўляецца ня толькі і ня столькі самы факт выкрыцьця вінаватага таго ці іншага недахопу (хаця і гэта важна), колькі выяўленьне прычыны, якія спрыяюць узьнікнавеньню гэтых недахопаў, што асабліва важна, гэта выяўленьне магчымасьцяй зьнішчэньня гэтых недахопаў такім шляхам, які забясьпечыў-бы вялікае паляпшэньне ў рабоце і выключаў-бы ўзьнікненьне гэтых недахопаў. Бязумоўна, што такі падыход у абсьледавацельскай рабоце больш цяжкі, чым адно выяўленьне факту таго ці іншага недахопу, але затое такі падыход забясьпечвае работнікам бюро скаргаў і актыву, прыцягнутаму да гэтай работы, больш шырокія магчымасьці сапраўды змагацца за паляпшэньне савецкага апарату.

М. КАЛІНІН.

* * *

Бюро скаргаў зьяўляецца базай, найбольш важным органам у сыстэме РСІ, іх работа для партыі мае надзвычай вялікае значэньне.

Праз гэтыя органы праходзяць дзесяткі тысяч скаргаў рабочых і сялян. Гэта багацейшы матар'ял з пункту гледжаньня таго, каб меркаваць па ім аб тых недахопах, якія маюць месца на прадпрыемствах прамысловасьці, у калгасе, у савецкім апараце. Таму добра пастаўленая работа бюро скаргаў можа сыгналізаваць нам аб „неблагополучии" на тым ці іншым вучастку нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы зараз ужо працуем у такой абстаноўцы, калі галоўнейшымі пытаньнямі ў адносінах да правільнай пабудовы савецкага і гаспадарчага апаратаў і іх работы зьяўляюцца не агульныя пытаньні, а канкрэтная барацьба з паасобнымі недахопамі і перанясеньне добрага, удалага вопыту на ўсю сыстэму савецкай і гаспадарчай работы. Трэба толькі дабіцца ў рабоце бюро скаргаў таго, каб ні адна скарга не засталася неразгледжанай, а з другога боку, трэба, каб уся работа бюро скаргаў насіла масавы характар і каб да праверкі і разгляду матар'ялаў, што паступаюць у бюро скаргаў, прыцягваліся-б шырокія масы рабочых і калгасьнікаў. У гэтым сэнсе работа гэтых органаў РСІ мае вялізарнае сацыялістычнае значэньне.

А. АНДРЭЕЎ.

За актыўны ўдзел шырокіх мас працоўных жанчын у пяцідзеньніку—праверкі бюро скаргаў.

Злепшых дэлегатак, актывістак-работніц, калгасьніц, жонак рабочых створым шырокі жаночы актыў пры бюро скарг.

Пры кожным дэлегацкім сходзе ў горадзе і вёсцы арганізуем з дэлегатак пастаянныя брыгады праверкі і кантроля РСІ.



Льнозавод у м. Крычаве.

Клясавая сутнасьць рэлігійнага сьвята „пэйсах“

Рэлігійнае сьвята „пэйсах“, як і ўсе іншыя сьвяты, зьяўляецца сьвятам цемры і эксплёататарскага ашуканства.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне выклікалі вялікі творчы ўздым працоўных БССР. Вырасла і колькасьць актыўных бязбожнікаў, сярод якіх значнае месца займаюць працоўныя яўрэі.

У глухіх мястэчках, якія калісь былі крыніцамі цемры, невуцтва і мракабесія, апорнымі пунктамі ўплыву рабінаў і цадыкаў, у вялікодныя дні 1931 году па ініцыятыве саміх працоўных мас былі высунуты лёзунгі ўзмацненьня ў дні рэлігійнага сьвята „пэйсах“ ударнай работы па ажыцьцяўленьні пяцігодкі. Прымаліся пастановы, каб у вялікодныя дні ня было ніводнага прагулу, каб ні адзін працоўны не пайшоў у сынагогу, ня еў мацы і ня выконваў рэлігійных абрадаў.

Ударніцтвам і сацспаборніцтвам адказвалі яўрэйскія рабочыя на заклікі замежнага яўрэйскага буржуазнага друку, які асабліва непакоіўся аб тым, што быццам у СССР працоўным яўрэям забараняецца сьвяткаваць „пэйсах“.

Аднак, сярод адсталых пластоў яўрэйскай беднаты і ў асабліваьці сярод жанчын многія яшчэ знаходзяцца ў палоне рэлігійнага дурману. Рэшткі разьбітага нэпманства і кулацтва пускаюць у ход тонкі яд рэлігійнага і нацыяналістычнага дурману. У гэтым яны сустракаюць вялікае падтрыманьне з боку клерыкалаў усяго сьвету і іх гаспадароў—імпэрыялістаў.

У кампаніі бязупыннага цкаваньня СССР і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі з боку сусьветнага імпэрыялізму, у контр-рэволюцыйным шкодніцтве з боку нашых клясавых ворагаў унутры краіны, не апошняе месца займае рэлігійная прапаганда.

Жанчына-вынаходца т. Загорская—зараз старшыня савету вынаходцаў ф-кі імя Зіноўева (г. Іванава-Вазьнясенска).

Асабліва выкарыстоўваецца для контр-рэвалюцыйнай агітацыі сярод працоўных яўрэяў рэлігійнае сьвята „пэйсах“. Клерыкалы стараюцца ўбіць у галаву, што „пэйсах“ па сутнасьці ня столькі рэлігійнае сьвята, колькі нацыянальнае сьвята яўрэяў. У вялікодных малітвах пасха так і завецца „дзень нашай свабоды“. У гэты дзень—гавораць рабіны і яўрэйская буржуазная інтэлігенцыя—бог вывеў яўрэяў, пад кіраўніцтвам Майсея, з эгіпэцкай няволі. Мала таго, бог не перастае рабіць цуды над яўрэйскім народам, пастаянна выратоўваючы яго ад шматлікіх ворагаў.

Ва ўсіх гэтых тлумачэньнях духоўнікаў сутнасьць адна—убіць у галаву, што ўсе яўрэі, бяз рознасьці клясаў, складаюць адно цэлае. Казка аб выбраным „богоспасаемом“ Ізраілю заўсёды была карысна яўрэям-эксплёататарам, і таму так старанна пашыраюць яны яе на ўсе лады. Ня толькі вялікоднае набажэнства, але і ўсе наогул яўрэйскія малітвы часта напамінаюць веруючаму яўрэю аб выхадзе з Эгіпту.

Між тым, усе апавяданьні аб выхадзе з Эгіпту і казка аб Майсеі зьяўляюцца нічым іншым, як міфам. Майсей такая-ж выдуманая асоба, як і хрыстос і буда... Казачны герой Майсей быў патрэбен іудэйскім царом і духоўнікам, каб угрунтаваць сваю эксплёататарскую ўладу. Гісторыя Эгіпту вывучана вельмі дасканала. Але нідзе няма ніякіх дакумантаў аб тым, што яўрэі былі ў Эгіпце, а потым вышлі адтуль. Наадварот, яўрэі ў эгіпэцкіх помніках таго часу ўспамінаюцца, як народ, які здаўна жыў у Ханаане.

Выхад з Эгіпту—гэта выдумка яўрэйскіх клерыкалаў. Нават такі мракабес, як галоўны рабін Францыі Ізраіль Леві, адмаўляе прабываньне яўрэяў у Эгіпце і выхад з яго.

Рэлігійнае сьвята „пэйсах“ зьяўляецца перажыткам старажытнага пэрыяду жыцьця яўрэйскага народу, калі яўрэі былі яшчэ вандраўнікамі-жывёлаводамі. У тыя часы ў іх быў звычай кожны год есьці ахвярную жывёлу. Калі яўрэі перайшлі да аседлага жыцьця і зямляробства, сутнасьць старога жывёлаводчага звычаю была забыта, але разам з гэтым узьнікла новае зямляробчае сьвята „апрэсьнікі“.

Пачатак жніва і ўкушэньне першых пладоў новага ўраджаю ва ўсіх першабытных народаў абстаўляліся асобнымі цэрэмоніямі. Першы хлеб новага ўраджаю даваўся духам. Гэты звычай і паклаў пачатак сьвята „апрэсьнікі“ (маца). Такім чынам, сьвята „пэйсах“ утварылася ад злучэньня двух, незалежных адно ад другога, рэлігійных сьвят у адно сьвята ў VII стаг. да нашай эры. Пасьля заняпаду самастойнага яўрэйскага царства са сьвятам „пэйсах“ і выхадам з Эгіпту сталі зьвязваць чаканьне мэсіі. Да гэтага зводзіцца ўвесь рытуал вялікоднай вячэры „сэйдару“. Усе малітвы, якія чытаюцца ў часе сэйдару, усе казкі і апавяданьні—усё гэта мае мэтай паказаць веруючаму яўрэю, што ўсемагутны бог ягава, вывеўшы яўрэяў з Эгіпту, выратуе іх яшчэ раз праз свайго мэсію. Рэлігія нацкоўвае працоўных яўрэяў супроць іншых нацый. За тое ўсе яўрэі, быццам,

між сабою роўныя, усе адналькава ляжаць на падушках па звычаі старажытных яўрэйскіх багатыроў, усе ядуць мацу, п'юць віно і нават самы бедны заве сябе ў часе сэйдару царом, а свайго старэйшага сына прынцам.

Яўрэйская пэйсахавая міфалёгія пабудавана ў інтарэсах эксплёататараў. Гэтай міфалёгіяй карыстаюцца і духоўнікі іншых рэлігій. Выхад з Эгіпту часта ўпамінаецца ў каталіцкіх пропаведзях і малітвах і на вячэрні ў вялікую суботу ў праваслаўных цэрквах таксама чытаецца аб выхадзе яўрэяў з Эгіпту.

Рабіны заклікаюць буржуазію ўсіх краін да зьнішчэньня савецкай улады. Галоўны рабін Англіі Гэрц яшчэ да абвяшчэньня крыжовага паходу супроць СССР выступіў з прамовамі, у якіх заклікаў эўрапэйскую буржуазію зьнішчыць уладу Саветаў. У антысавецкім цкаваньні, якое разгарэлася вясною 1930 году, яўрэйскія рабіны Амэрыкі, Англіі і Польшчы выявілі асаблівую злобу і шаленства.

Менш прыкметна, але больш шкодна падрыўная работа яўрэйскіх клерыкалаў унутры нашага Саюзу, дзе яны імкнуцца ўнесьці разлажэньне сярод адсталых рабочых, саматужнікаў, і ў асаблівасьці сярод сялян, калгасьнікаў і аднаасобнікаў-беднякоў і серадняком. У гэтым годзе, бязумоўна, мракабесная дзейнасьць яўрэйскіх клерыкалаў значна ўзмоцніцца. Яўрэйскія клерыкалы, а разам з імі і рэшткі яўрэйскай буржуазіі ў СССР будуць імкнуцца перашкодзіць ажыцьцяўленьню плянаў 4-га заключнага году пяцігодкі і пляну 3-яй бальшавіцкай вясны. Іх агітацыя будзе накіравана ў асаблівасьці на працоўных яўрэйскіх жанчын.

Адсталыя працоўныя яўрэйскія жанчыны, як і працоўныя жанчыны іншых нацменшасьцяй БССР, складаюць для клерыкалаў усіх колераў і гатункаў добрую глебу для разгортваньня ім мракабеснай работы. Рэлігійнае засільле ў быце адсталай працоўнай жанчыны яшчэ трымаецца да гэтага часу. Прыгатаваньне „пэйсаху", пячэньне мацы, уборка кватэры і іншыя рэлігійныя забабоны, зьвязаныя з „пэйсахам", выконваюцца галоўным чынам жанчынамі.

У сучасны момант мы наглядаем значны антырэлігійны рух сярод працоўных жанчын наогул і працоўных жанчын-яўрэек—у прыватнасьці. Надыходзячае рэлігійнае сьвята „вялікадзень" павінна быць спаткана працоўнымі яўрэйскімі жанчынамі поўным байкотам. Трэба адмовіцца ад усялякіх рэлігійных забабонаў, зьвязаных з „пэйсахам". Неабходна, каб працоўныя яўрэйскія жанчыны ажыцьцявілі сто проц. выхад на работу ў дні „пэйсаху", арганізавалі-б на прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах і жактах асобныя бязбожныя ўдарныя брыгады і наладзілі бязбожныя суботнікі. У адказ на падрыхтоўку імпэрыялістамі і іх агентурай—духоўнікамі інтэрвэнцыі супроць СССР неабходна, каб працоўныя яўрэйскія жанчыны ўзмацнілі сваю работу па абароне нашай краіны і прынялі актыўны ўдзел у зборы сродкаў на падводную лодку „Ваяўнічы бязбожнік". Антывялікодная кампанія павінна пацягнуць за сабою масавае ўступленьне працоўных яўрэйскіх жанчын у рады ваяўнічых бязбожнікаў (СВБ). Да гэтага часу працоўныя жанчыны ў СВБ складалі толькі 28%. Неабходна давесьці гэты процант у часе антывялікоднай кампаніі ня менш як да 40%.

Лепшым нашым адказам на буржуазна-кулацкае сьвята „пэйсах" будзе ўзмацненьне нашай работы па выкананьні пяцігодкі за 4 гады і разгортваньне сыстэматычнай культ-масавай работы.

Даўгаполаў.

Калгасьніца Сенькан—актывістка па распаўсюджаньні насеннай пазыкі

Калгас „Чырвоны араты" арганізаваўся ў 1930 годзе з 6 сем'яў, зараз мае 35 сем'яў. Зямлі 218 *га*. Уборачную кампанію ў мінулым годзе скончыў з посьпехам. Ухіл калгасу ільнаводчы. У мінулым годзе ільну было пасеяна 40 *га*, а зараз паводле плану—50 *га*.

Калгас „Чырвоны араты" да веснавой сяўбы падрыхтаваўся. Калгас поўнасьцю забясьпечан насеньнем як яравых, так і тэхкультур. Складзен страхавы фонд—бульбы 20 *цнт.*, аўса—13 *цнт.*, збожжа—6 *цнт.* Насенны і страхавы фонд добра захаваны. Абязьлічка ў калгасе поўнасьцю ліквідавана. Да кожнага калгасьніка і калгасьніцы прымацаваны конь і вупраж. Калгасьнікі разьбіты на дзьве брыгады: жывёлагадоўчая — з 7 асоб, паляводчая—з 26 асоб. Брыгадзірамі вылучаны лепшыя ўдарнікі-калгасьнікі, якія сапраўды апраўдалі сябе на працы.

Сярод членаў праўленьня таксама ліквідавана абязьлічка. Кожны член праўленьня адказвае за тую ці іншую працу ў калгасе.

Плян веснавой сяўбы калгасьнікамі прынят і высунут сустрэчны на 18 *га*, ільну—5 *га*, вікі—7 *га*, збожжа—5 *га* і яравых—1 *га*. На агульным сходзе 29-III вылучылі буксірную брыгаду з 5 асоб калгасьнікаў на дапамогу ў падрыхтоўцы да вясны калгасу „Чырвоны прамень" і „Новы мір". Выпрацавалі канкрэтныя пункты сацумовы. Арбітр — рэдакцыя раённай газэты. Праўленьне калгасу вызначыла 100 р. прэміяльных на пасеўную кампанію.

Па ініцыятыве старой калгасьніцы тав. Сенькан В.—бяднячкі—унесена прапанова аб распаўсюджаньні насеннай пазыкі. Сама яна першай падпісалася на 1 пуд бульбы.

Праз рэалізацыю насеннай пазыкі сабрана 29 пудоў бульбы. Выдзелена брыгада па распаўсюджаньні насеннай пазыкі сярод калгасьнікаў і аднаасобнага сэктару. На чале гэтай брыгады—калгасьніца тав. Сенькан Валянціна.

Брыгада: Лукіна, Грумбіна.

Па-ўдарнаму рыхтуемся да 3-яй бальшавіцкай сяўбы

У Лепельскім раёне, Замоскага сельсавету, калгас імя Сталіна сапраўды па-бальшавіцку падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. На 100 проц. закончана засыпка страхавых і насенных фондаў, заканчваецца рамонт машын, інвэнтару і зброі, у некаторых аддзяленьнях, як Стайчаўка і інш., ужо зроблен пробны выезд у поле.

Калгасьнікі калгасу імя Сталіна абвяшчаюць сябе ўдарнікамі па правядзеньні веснавой сяўбы і па выкананьні і перавыкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

Казакевіч Марыля.

Дэлегаткі, работніцы, калгасьніцы, працоўныя сялянкі, застаўшыйся насенных рэсурсаў калгасаў, шляхам распаўсюджаньня насеннай паэ інвэнтара і машын. Канчаткова аформім вытворчыя брыгады ў

Прыклад „Чырвонага пагранічніка"—ва ўсе калгасы

Калгас „Чырвоны пагранічнік" па-бальшавіцку рыхтуецца да вясны. Калгасьнікі разьбіты на брыгады, усяго брыгад—11. Да брыгад прымацован інвэнтар, які цалкам адрамантаваны, а таксама жывёла і зямельныя вучасткі. Зроблен добры падбор брыгадзіраў, з іх адна жанчына—Грынкевіч Люба. Гной вывезен выключна жаночымі брыгадамі. У калгасе адчуваўся недахват насеньня гародніны. Парт'ячэйка і праўленьне калгасу мабілізавалі на гэту справу калгасьніц. На кожным вучастку створаны жаночыя ўдарныя брыгады, якія зьбіраюць насеньне шляхам распаўсюджаньня сацыялістычнай пазыкі.

— На сёнешні дзень брыгады жанчын сабралі насеннай цыбулі 34 кгр., ячменю—40 кгр., аўса—24 кгр., гародніны—70 кгр. Гэта сабрана толькі па пяці брыгадах, у іншых брыгадах збор працягваецца. Разам з гэтымі дасягненьнямі неабходна адзначыць, што парт'ячэйка яшчэ слаба разгортвае культ-выхаваўчую работу сярод калгасьніц. Праца дэлегацкага сходу да гэтага часу адсутнічала, але зараз у сувязі з перавыбарамі дэлегацкага сходу справа пачынае наладжвацца. Няпісьменныя калгасьніцы ня ўсе наведваюць лікпункт.

У далейшым парт'ячэйцы неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на культурна-выхаваўчую работу сярод калгасьніц і на ўцягненьне лепшых з іх у рады партыі і камсамолу.

К.

Ударніцы па ачыстцы ільнанасеньня у к-се „На Варце" Крычаўскага р-ну Новікава і Бондарава разглядаюць чыстасортнасьць лёну.

Рыхтуйцеся так, як калгас „Новае жыцьцё"

Сьнегу зусім няма на ўзгорках, ды і ў нізіне сьнег толькі наверсе, а пад ім вада. Сонца ўжо добра прыгравае, дарога псуецца. Усё гэта прымушае ўзмоцнена рыхтавацца да сяўбы.

Калгас „Новае жыцьцё" (Заслаўскі раён, Барздынскі сельсавет) яшчэ 15-га сакавіка на пробным выезьдзе паказаў сваю баявую гатоўнасьць да веснавой сяўбы.

Калгасьнікі зразумелі, што ссыпка насенных і страхавых фондаў у падрыхтоўцы да сяўбы—асноўная і адказьнейшая задача. Таму насеньне і страхавыя фонды ссыпаны поўнасьцю: аўса—196 цэнт., ячменю—30 цэнт., гароху—21 цэнт., ільну—5 цэнт., бульбы трэба 1.040 цэнт., ёсьць 1046 цэнт.

Пастанова ЦК ад 4-га лютага аб арганізацыі брыгад, неадкладна праламілася ў жыцьці калгасу. Калгасьнікі разьбіты на шэсьць брыгад і ўжо зараз пабрыгадна выконваюць працу. Да брыгад прымацаваны коні, сельска-гаспадарчы інвэнтар, і кожны калгасьнік нясе адказнасьць за прымацованае. Рамонт інвэнтару ня менш важная задача. Гэта таксама ўлічана калгасьнікамі. Адрамантавана плугоў 46 штук, боран 66 штук, хамутоў—110 штук, акучнікаў—11 штук.

Вялікая ўвага зьвернута на павышэньне ўраджайнасьці. Жаночая брыгада ў складзе т. т. Пашкевіч, Дубавік, Крэмес, Закаблук, Нартовіч, Ляўковіч сабрала 8 цэнт. попелу. У калгас завезена 10 цэнт. штучнага ўгнаеньня. Вывазка гною зараз вызваляе шмат працоўных рук у веснавую кампанію. Ацаніўшы правільна гэта становішча калгас ужо вывез гной на 95 проц. Гэтыя дасягненьні атрыманы дзякуючы добраму кіраўніцтву работай старшыні калгасу—камуніста тав. Жэрліна, які за ўзорную арганізацыю працы на Паўночным Каўказе атрымаў ордэн Чырвонага Сьцягу.

* * *

Каля самага лесу разгортваецца будаўніцтва птушніцкай гаспадаркі. Частка ўжо пабудавана, на другую частку прывезена драўніна і ў летні будаўнічы сэзон будзе пабудова закончана.

Птушнік мае 3 аддзяленьні. У першым аддзяленьні разьнясьціліся чырвоныя хахлаткі, у другім белыя міноры, у трэцім пеўні, якія сваімі звонкімі сьпевамі напаўняюць веснавое паветра. Каля краёў будынку ёсьць спэцыяльныя гнёзды, дзе куры нясуцца.

Прыкладна даглядае курэй ударніца Дубавік Ядзя, яе можна заўсёды спаткаць на фэрме. Пільна, вопытным вокам яна сочыць за тым, каб ні адно яйка не прапала марна. На фэрме зараз 600 штук курэй, фэрма яшчэ толькі разьвіваецца. Зараз з інкубатарнай станцыяй заключан дагавор на 3 тысячы куранят для камплектаваньня курацяніка.

* * *

Грамадзкае харчаваньне ў веснавую пасеўную кампанію будзе адыгрываць вялізарную ролю. Лагодна ўсьміхалася новая сталоўка калгасьнікам. Плякаты, лёзунгі, агітуючы за ўдарную і сваячасовую сяўбу, разьвешаны на сьцяне. Сталы з чыстымі абрусамі, венскія крэслы. У сталоўцы праводзіцца радыё.

Чыстая кухня. Работніцы, што абслугоўваюць абедаючых, у чыстых халатах, добрыя адносіны да рабочых. Абеды, сьнеданьні і вячэры добраякасныя, ёсьць адкормачны пункт. Гэта сапраўды бальшавіцкае выкананьне пастановы ЦК аб грамадзкім харчаваньні. Сталоўка калгасу „Новае жыцьцё"—прыклад іншым калгасам, як трэба лічыцца з запатрабаваньнямі калгасьнікаў. Так рыхтуе калгас „Новае жыцьцё" сталоўку

Усебеларускі рэйд ударніц часопісі па праверцы падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы

застаўшыйся час да сяўбы скарыстайце для мабілізацыі ўнутраных насеннай пазыкі, стопрсцантнай ачысткі насеньня і поўнага рамонту я брыгады ў калгасах, падрыхтуем моцныя кадры брыгадзіраў

т. Пашке-
к, Нарто-
. попелу.
штучнага
раз вызва-
веснавую
гэта ста-
гной на
атрыманы
работай
тав. Жэр-
ыю працы
наў ордэн

вецца бу-
кі. Частка
стку пры-
аўнічы се-
.
У першым
чырвоныя
ры, у трэ-
і сьпевамі
ра. Каля
оцыяльныя

ударніца
сёды спат-
ным вокам
дно яйка
рме зараз
чэ толькі
рнай стан-
3 тысячы
ня курат-

веснавую
дыгрываць
сьміхалася
Плякаты,
і сваяча-
на сьцяне.
енскія крэ-
радыё.
што абслу-
их халатах,
их. Абеды,
раякасныя,
сапраўды
гановы ЦК
Сталоўка
рыклад ін-
ацца з за-
Так рых-
сталоўку

да вясны. Праектуецца адкрыцьцё 3-х ясьляй, кадры ўжо падрыхтаваны.

Калгас „Новае жыцьцё"—прыклад бальшавіцкай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

К.

Слова калгасьніцы-ўдарніцы лепельшчыны

Зьехалася на раённы зьлёт 49 чалавек, для таго, каб абгаварыць пытаньне аб веснавой сяўбе.

Ведалі, што нарада старшынь калгасаў, якая нядаўна адбылася, выклікала *Полацкі раён* на сацспаборніцтва, на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы. Гаварылі, што сьцяг імя X зьезду, які *яны атрымалі* за добра праведзеную пасеўную кампанію ў мінулым годзе, трэба абавязкова ўтрымаць.

Пасьля дакладу аб веснавой пасеўнай задачах ударніц разгарнуліся спрэчкі.

Ударніца Стэльмашонак дакладна адрапартавала зьлёту аб перамогах калгасу „Чырвонае Забалоцьце". Насеньне засыпана і ачышчана. Страхавыя фонды засыпаны. Усе працаздольныя калгасьнікі разьбіты на брыгады па вытворчым прынцыпе. Не хапае насеньня ільну, але калгасьнікі ўзяліся шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, праз распаўсюджаньне насеннай пазыкі ільнасемя сабраць.

Стэльмашонак тлумачыць калгасьнікам, што дабіліся яны гэтых посьпехаў дзякуючы правільнай арганізацыі працы, ліквідацыі абязьлічкі.

Бельская, з калгасу „Барэц свабоды", расказала, што з насеньнем яны справіліся, кармоў хопіць у калгасе.

Але не ва ўсіх калгасах з насеньнем добра, аб гэтым сьведчыць зводка аб засыпцы насенных фондаў па раёне, з якой відаць, што на 20 III збожжавых засыпана 85 проц., тэхнічных—60 проц., бульбы—85 проц., і вікі 60 проц.

Дрэннае становішча з насеньнем у калгасе „Чырвоная зорка". Ударніца Куноўская расказвае: „Насеньне ільну пагніло ў нас на 50 проц. з прычыны дрэннага захаваньня, гарох таксама згніў і таму гэтага насеньня ў нас ня хопіць для пасеву. Пануючая абязьлічка ў нашым калгасе прывяла да вельмі дрэннага становішча коняй".

Наста Прыстаўка з Ліпчанскага калгасу паведаміла, што насеньне яны скармліваюць коням.]

З увагай усе выслухалі Ганчарову Марылю — брыгадзіра з калгасу „Савецкая Беларусь". У яе прамове адчувалася ўпэўненасьць у сваёй справе і сіла: „Ёсьць у нас недахопы,—гэта праўда,—гаворыць Марыля Ганчарова,—але многія недахопы можна ліквідаваць, калі сумленна, па-ўдарнаму працаваць. Наш калгас мае і насеньне і кармы і да вясны мы ўжо падрыхтаваліся. У чым сакрэт нашых посьпехаў? Мы з восені працавалі брыгадамі па-ўдарнаму. Ніводнай травінкі, ні саломінкі не засталося на полі. Лён мялі і ўначы і ўдзень, каб машыны ня гулялі. Я з невялічкай сваё дзяўчынкай выпрацавала 400 працадзён. Былі і такія, якія сьмяяліся з мяне, калі я іх клікала на працу, але я на гэта не зварачала ўвагі. Рабіла так, як для сябе. Трэба адно памятаць, што ад нас усё залежыць. Калі не хапае насеньня, трэба шчыра ўзяцца за распаўсюджаньне насеннай пазыкі і сабраць насеньня. А гультаём трэба сказаць, што ім няма месца ў калгасе. Ня трэба слухаць шэптаў падкулачнікаў. Адкажам на гэтыя шэпты ўдарнай працай па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, гэтым мы зробім моцнымі нашы калгасы.

Ёсьць адзін вялікі недахоп, які вельмі нам перашкаджае яшчэ ў працы, гэта слабае інструктаваньне нас брыгадзіраў. Ніхто нас ня вучыць, як трэба працаваць, прыходзіцца да ўсяго самім даходзіць. Патрэбен сталы інструктаж для брыгадзіраў і таксама розныя тэхнічныя гуртки, якія-б вучылі нас працаваць.

Непакояць калгасьніц марудныя тэмпы ў падрыхтоўцы раёну да адкрыцьця ясьляй і дзіцячых пляцовак. Курсы дашкольніц да гэтага часу не распачалі сваю працу.

Вайцэхоўская Марыля з Гогалеўкі патрабуе адкрыцьця ясьляй. У яе шасьцёра дзяцей, самай большай дзесяць год. „Працаваць хачу — гаворыць яна—ясьлі да зарэзу патрэбны".

Лепшых ударніц — 18 чалавек—удзельніц зьлёту Райкалгассаюз прэміяваў прамтаварамі.

Калгасьніцы абвясьцілі сябе ўдарніцамі 3-й бальшавіцкай вясны і ўдарніцамі друку.

У адказ на адозву Віцебскіх калгасьніц, ударніцы зьлёту прынялі на сябе рад абавязацельстваў і абяцалі па-баявому, па-ўдарнаму іх выканаць.

К—вг

Лепель.

180 рублёў на абарону краіны

На ўрачыстым вечары прысьвечаным 8 му сакавіку ў саўгасе „Беліца" (Сенненскі раён) жанчыны сабралі ў фонд абароны краіны 180 руб. Тут-жа выбралі бюро ячэйкі Асоавіяхіму.

Хв. Клімянок.

Калгасьнікі здаюць насеньне ў парадку мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

ГПБ Оп.-аз.

Арганізуем брыгады, праверым падрыхтаванасьць да вясны

Сабраліся ўдарніцы-калгасьніц ўсяго Пышнянскага сельсавету, каб падзяліцца вопытам працы па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

Большасьць з іх сабраліся з калгасу „Чырвоны прамень", ім ня трэба далёка хадзіць, з хаты да школы, дзе сабраўся зьлёт,— толькі некалькі крокаў.

Праслухаўшы даклад аб задачах ударніц у веснавой пасеўнай кампаніі, ударніцы расказалі аб працы сваіх калгасаў.

Пытаньне захаваньня маладняка і арганізацыі працы ў калгасах больш за ўсіх іншых цікавіла ўдарніц. Пад абстрэл зьлёту была ўзята сьвіная фэрма калгасу „Чырвоны прамень", якая працуе вельмі дрэнна. Зьлёт патрабаваў ад ударніц фэрмы, каб яны сказалі сваё слова.

Тацьцяна Крывец — лепшая ўдарніца фэрмы—выклікала на сацспаборніцтва Валенціенак Проспу, Юхнавец Вольку, Харленак Юспу, Гардзіёнак і інш. на лепшы догляд за маладняком. Працуючыя на фэрме запэўнілі зьлёт, што прарывы на фэрме будуць ліквідаваны.

Удзельніцы зьлёту абвясьцілі сябе ўдарніцамі трэцяй бальшавіцкай вясны. Абавязаліся да 5-га красавіка аформіць вытворчыя брыгады. Праверыць падрыхтаванасьць да вясны інвэнтару і збруі. Стварыць жаночыя брыгады ў сваіх калгасах па распаўсюджаньні насеннай пазыкі. Увесьці ў сыстэму вытворчыя нарады на сьвіных фэрмах, дзе абгаворваць пытаньне працы фэрмы. Усю сваю працу асьвятляць у сваім раённым друку і ў часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі".

На зьлёце былі прэміяваны ўдарніцы з калгасу „Работніца і калгасьніца Беларусі": Амелька Дар'я, Рачыцкая Наста, Рачыцкая Сьцепа, Місьнік Ульяна,

Тацяна Крывец.

Кубар Аксіньня і Пятух Тоня за ўдарную працу ў часе ўборачнай і падрыхтаванасьць да веснавой сяўбы.

Брыгада сьвінарак калгасу „Чырвоны Прамень",

Да арганізацыі брыгад падыйшлі фармальна

Ачысьціць калгас ад кулакоў і падкулачнікаў

Пышнянскі сельсавет налічвае 10 калгасаў. Сельсавет мае жывёлагадоўчы напрамак. Пляны даведзены да кожнага калгасу. У сувязі з тым, што жывёлагадоўчы напрамак канчаткова вызначан толькі ў гэтым годзе, — у пасеўных плянах ёсьць значныя зьмены ў параўнаньні з мінулым годам. Напрыкл., калгас „Работніца і калгасьніца Беларусі" ў мінулым годзе сеяў 11 *га* ільну з 83 *га* ўсёй плошчы, у гэтым годзе ільну зусім сеяць ня будзе, і адводзіць больш пад кармовыя травы.

Падрыхтоўка да веснавой па сельсавеце разгорнута слаба. Свайго насеньня ў калгасах не хапае за выключэньнем толькі калгасу „Работніца і калгасьніца Беларусі" і, ня гледзячы на гэта, насенная пазыка папулярызавана вельмі слаба. Брыгады па распаўсюджаньні пазыкі ў калгасах ня складзены.

Асабліва недахват адчуваецца ў насеньні кармовых траў.

Вельмі дрэнна стаіць справа з арганізацыяй ў калгасе сталых брыгад па вытворчым прынцыпе. Аб гэтым сказалі ўдарніцы на зьлёце, які адбыўся ў Пышне, і адкрыты партыйны сход сельсавецкай ячэйкі. З вялікім спазьненьнем парт'ячэйка прапрацавала пытаньне арганізацыі брыгад (31 сакавіка). Калгасы да арганізацыі брыгад падыйшлі фармальна — разьбілі калгасьнікаў на брыгады і толькі. Не да ўсіх вучасткаў зямлі прымацаваны брыгады, вытворчыя заданьні яшчэ не прапрацаваны ў саміх праўленьнях. Некаторыя праўленьні („Чырвоны прамень", „Усход") тлумачаць гэта адсутнасьцю расцэнкі норм у працаднёх, што нібы не дае магчымасьці скласьці вытворчыя пляны для брыгад.

У калгасе „Барэц" брыгады зусім не арганізаваны. Старшыня гэтага калгасу на адкрытым сходзе заявіў—„чорт іх ведае, як іх арганізаваць". Гэта сьведчыць, што з боку сельсавету і партарганізацыі ня было належнай растлумачальнай працы вакол гэтага пытаньня.

А клясавы вораг ня сьпіць, ён робіць сваю агідную контр-рэвалюцыйную справу, выкарыстоўваючы нашы памылкі. Калгасьнік Калбасёнак арганізаваў суботнік дзяўчат для ачысткі царкоўнага двара. Мала гэтага, ён арганізаваў прыезд папа ў пышнянскую царкву. Сьвядомыя калгасьнікі далі адпор такім дзеяньням, яны сказалі, што мы даўно забылі дарожку да царквы і дарэмна яе расчышчалі. Але сам факт сьведчыць аб тым, што сярод калгасьнікаў ёсьць яшчэ Калбасёнкі, якія пяюць у адну дуду з нашым клясавым ворагам.

Брыгады ўдарніц, якія будуць праводзіць узаемаправерку падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы, найбольшую ўвагу павінны зьвярнуць на правільную арганізацыю працы і ссыпку насеньня.

В.

Слова ўдарніцы фінфронту

У дакладах, зробленых на Ўсебеларускім зьлёце ўдарніц фінфронту, і ўступнай прамове т. Хацкевіча падкрэсьлены тыя вялікія дасягненьні, якія мае наша партыя і савецкая ўлада як па ўсім Саюзе, так, у прыватнасьці, і па БССР. Пабудаваны новыя заводы і фабрыкі, па апошнім слове тэхнікі перабудавалі старыя, навучыліся рабіць машыны, якія раней прывозіліся з-за мяжы. Перабудоўваем сельскую гаспадарку. Будуем новыя культбытавыя ўстановы.

На ўсё гэта былі патрэбны вялізарныя сродкі. Мы самі сваімі сіламі сабралі гэтыя сродкі.

Перадавікамі ў справе мабілізацыі сродкаў, якія перавыканалі свае пляны, зьяўляюцца гарады: Менск, Гомель, Віцебск і раёны: Тураўскі, Сіроцінскі, Заслаўскі, Рэчыцкі, Мазырскі, Мсьціслаўскі, Чырвона-Слабодзкі, Быхаўскі, Церахоўскі, Жыткавіцкі, Бабруйскі і Лёзьнянскі.

Работніцы, калгасьніцы і працоўныя жанчыны прымалі актыўны ўдзел у мабілізацыі сродкаў, у выкананьні фінплянаў.

Дамо слова самім ударніцам фінфронту, паслухаем, як яны на мясцох—на фабрыках, заводах, у саўгасах і калгасах—змагаюцца за выкананьне фінплянаў. Яны зьехаліся з усёй Беларусі. Многія з іх упяршыню прыехалі ў Менск. Іх, як лепшых перадавікоў, паслала маса на Ўсебеларускі зьлёт, каб падзяліцца вопытам працы.

Работніца тав. Бэрхіна з фабрыкі „Прафінтэрн“ (гор. Віцебск) падзялілася цікавым вопытам працы сваёй фабрыкі ў галіне мабілізацыі сродкаў. Фабрыка „Прафінтэрн“ зьявілася ініцыятарам „Сталінскага чырвонца“. У выніку гэтага рабочыя і работніцы пазычылі дзяржаве 1.700 чырвонцаў.

Ударніца калгасьніца з Заслаўскага раёну тав. Зубкоўская падрабязна тлумачыць зьлёту, якім чынам яны змаглі выканаць фінплян на 100 проц.

„Па нашым калгасе імя Дзяржынскага праведзена 17 дэлегацкіх сходаў. Зразумела, што мы сваімі сходамі паднялі жанчын на працу па мабілізацыі сродкаў. Наша школа, якая налічвае 120 вучняў, правяла вялікую работу па мабілізацыі сродкаў, па ўцягненьні ўкладчыкаў у ашчадкасу. Мы растлумачвалі на сходах жанчын і дэлегатак аб падрыхтоўцы да 3-яй бальшавіцкай вясны. Нашы калгасьніцы ўступілі ў сацспаборніцтва. Мы, дзякуючы правільнаму кі-

Тав. Зубкоў ка.

раўніцтву нашай партыі, зьнішчылі межы і зараз трактары гудуць на шырокіх палёх. У нас у калгасе ёсьць і другія машыны. Мы, жанчыны, самі правяралі, як у нашым калгасе ідзе праца па падрыхтоўцы да сяўбы, праверылі спраўнасьць інвэнтару, зброі, догляду коняй і інш. Нашы брыгады знайшлі дрэнны догляд коняй у IV брыгадзе. Мы ўзьнялі пытаньне аб паляпшэньні працы ў гэтай брыгадзе і паращылі замест прэміі выдаць ім акуляры, каб надалей пільна сачылі за працай. Мы самі сочым, каб ссыпанае насеньне ня згніло і не папрэла. Насеньня ў нас хапае, а пшаніцы нават ёсьць лішак.

Калгасьнікі ў нас разьбіты на брыгады па вытворчым прынцыпе. Кожная брыгада вылучыла тройку, якая сочыць за захаваньнем насеньня.

Зубкоўскую ўсебеларускі зьлёт прэміяваў, як лепшую ўдарніцу фінфронту.

Ясінская—з Жыткавіцкага раёну. „З 15-га сакавіка мы ў раёне абвясьцілі штурм, бо пляны па мабілізацыі сродкаў у нас выкананы толькі на 78,7 проц. Праца, праведзеная ў часе штурму, дала свае вынікі. Рад сельсаветаў пляны перавыканалі, у тым ліку перавыканаў свой плян і местачковы савет.

Мы паставілі пытаньне мабілізацыі сродкаў на прафсаюзных сходах, на сходах у калгасах, саўгасах і вёсках.

На ўсіх гэтых сходах мы вылучалі спэцыяльныя брыгады па мабілізацыі сродкаў, брыгады вельмі добра дапамаглі ў працы. Брыгады выявілі, што некаторыя гаспадарнікі затрымліваючы грошы на рукі, несвоечасова іх здаюць у банк. Выкрылі рад выпадкаў нявыплаты каапэрацыйнага паю пры наяўнасьці вялікай зарплаты. Працу брыгад заслухоўвалі на пасяджэньнях саветаў і жорстка білі па зрыўшчыках фінплянаў. Шляхам разгортваньня масавай працы стварылі грамадзкую думку вакол пазыкі „Трэці рашаючы“ і, як вынік, мелі дадатковую падпіску“.

Работніцы з трыбуны зьлёту дзеляцца сваім вопытам працы ў парадку самакрытыкі, указваюць на недахопы працы ашчадкас.

Віцебская дэлегацыя на зьлёце. Зьлева направа: Берхіна, Іцэлсон, Якімава і Краўцова.

Дорская з фабрыкі „Камунарка“ (Менск) перадала шчырае прывітаньне зьлёту ўдарніц ад работніц фабрыкі.

„У трэцім квартале мінулага году наша фабрыка ў галіне мабілізацыі сродкаў мела прарыў. У чацьвертым квартале мы перабудавалі ўсю сваю працу пановаму, у тым ліку і працу па мабілізацыі сродкаў, і маем вынікі—плян 4-га кварталу ў нас выканан поўнасьцю. Плян 1-га кварталу 1932 году мы выканалі на 136 проц. Зараз не праходзіць ні аднаго пасяджэньня ні фабкому, ні бюро парткалектыву, дзе-б не заслухоўвалі камсад.

Мы ў зьменах і цэхах вылучаем буксірныя брыгады ў дапамогу адсталым. У нас былі-б яшчэ большыя посьпехі, калі-б камсад павёў працу з актывам. Да гэтага часу ўсякая работа адсутнічае.

Агульна-гарадзкі камсад дрэнна кіруе. Я трэці год працую ў складзе фабрычнага камсаду і за гэты час толькі 2 разы выклікалі наш камсад для справаздачы. Мяне з прадпрыемства вылучылі на фінансавую працу, я з вялікім задаваленьнем згадзілася. Мне абяцалі, што будуць курсы, дзе можна падвучыцца, але курсаў і да гэтага часу няма, а без падрыхтоўкі працаваць дрэнна“.

Ад імя рэчыцкіх работніц-ударніц выступіла тав. Стругач.

„Зараз фінплян ў нас выкананна 101,8 проц. Мы змаглі перавыканаць свой фінплян дзякуючы дапамозе з боку нашай раённай газэты „Рэчыцкая праўда“, якая ўзяла на буксір адстаючыя прадпрыемствы. У гэтыя прадпрыемствы былі накіраваны брыгады, праведзена была адпаведная праца, і плян выканалі: па швэйнай фабрыцы—на 6.060 руб., па запалкавай — на 5.700 руб., па заводзе імя

Тав. Дорская—ударніца фінфронту.

Томскага — на 1.500 руб. Мы правялі працу па ўкладу сацыялістычнага чырвонца.

Работа нашых ашчадкас кульгае. Працаўнікі сядзяць і чакаюць, пакуль укладчыкі прынясуць ім грошы, масавай работы не праводзяць. Рэчыцкае аддзяленьне Дзяржбанку да гэтага часу ня выдала акцый Трактарацэнтру. Гэта затрымлівае пасьпяховае распаўсюджаньне гэтых акцый. Калі мы ня выканаем нашых плянаў, то гэта будзе на руку нашаму ворагу.

Патрэбна штодзенная праца па выкананьні фінплянаў“.

Тав. Фарбэр (Менск) расказала зьлёту аб працы жонак рабочых і наогул хатніх гаспадынь у галіне мабілізацыі сродкаў. Жактамі быў абвешчан дэкаднік штурму прарыву на фінфронце. У часе дэкадніка было арганізавана 145 брыгад з ахопам 455 чалавек. Быў спэцыяльны сход дэлегатак па пытаньні мабілізацыі сродкаў. Вынікі працы, праведзенай у часе дэкадніка, значныя. 330 хатніх гаспадынь завербаваны ў ашчадкасы. Каапэравана новых 3.075 хатніх гаспадынь. Праведзена дадатковая падпіска на пазыку „Трэці рашаючы“ на суму 3.425 руб.

Ударніцы зьлёту абяцаліся надалей па прадпрыемствах, калгасах і саўгасах праводзіць пастановы ўсебеларускага зьлёту ўдарніц фінфронту. Стварыць актыў на фабрыках, заводах, у калгасах і саўгасах для гэтай працы.

К—ва.

Падхапіць ініцыятыву ф-кі „Чырвоны прафінтэрн“

Бальшавіцкае змаганьне за фінплян паказвае фабрыка „Чырвоны прафінтэрн“ (гор. Віцебск). Ёю высунута ідэя „сацыялістычнага чырвонца“, якая зараз падхопліваецца іншымі прадпрыемствамі і калгасамі.

Абвешчаны на фабрыцы фінштурм даў бліскучыя вынікі. Шляхам стварэньня буксірных брыгад і шырокай растлумачальнай працы рэалізавана пазыка „3-ці рашаючы“ на 106 пр., застрахавана 1600 асоб, на добраахвотных узносах у ашчадкасу заданьне выкана на 105 пр.

1700 сацыялістычных чырвонцаў пазычаны дзяржаве на 10 месяцаў. Ініцыятыву Прафінтэрнаўцаў, аб рэалізацыі „сацыялістычнага чырвонца“—усім прадпрыемствам, калгасам, саўгасам.

Бэрхіна.

Уключымся ў фінпаход

Зьлёт ударніц фінфронту Першамайскага сельсавету, Слуцкага раёну, узяў на сябе рад канкрэтных абавязкаў у галіне мабілізацыі сродкаў.

Усе ўдзельніцы зьлёту ў колькасьці 15 чалавек сталі ўкладчыкамі ашчадкасы і тут-жа ўнесьлі 52 руб.

Кожная ўдарніца ўзяла на сябе абавязак сабраць розных відаў укладаў ня менш як на 50 руб. за два тыдні.

Гаварунова.

Магілеўская дэлегацыя на зьлёце ўдарніц фінфронту т. Фрадкіна (шаўк. фабр.), Гурэвіч (хлебазавод), Серабракова (ф-ка імя Валадарскага).

Маруська шахцёрка

АНДРЭЙ МАНЬКОЎ

(Працяг)

III

Дзень быў сьвяточны. На рынку стаялі калёсы з падвязанымі ўгору аглоблямі. Сонца было якраз напоўдні, бязьлітасна прыпякала. Местачковыя гандляркі, як ніколі, сёньня зараблялі на зэльтэрскую. Брынчэлі званы местачковай царквы, а праз адчыненыя дзьверы даносіўся гнусавы голас папа:

— Мірам госпаду памолімся-я-а.

Але-ж не маліўся мір. Моладзь, што прыехала на рынак, адразу па некалькі чалавек заходзілі ў нардом. Сёньня сход сялян мястэчка. Кожны хацеў паслухаць, аб чым у нардоме гавораць. Са сцэны кідаў запальваючыя словы здаровы энэргічны мужчына:

— Партыйцы, камсамольцы, лепшыя калгасьнікі, беднаты і сераднякі павінны дапамагчы Данбасу. Фабрыкам, заводам і чыгункам патрэбен вугаль. Мы гэты вугаль дамо...

Антось быў вельмі задаволен, што выпадковасьць дапамагла яму трапіць на сход. Словы прадстаўніка Данбасу моцна ўрэзваліся ў сьвядомасьць Антося. Ён уважліва слухаў дакладчыка, які падрабязна расказваў аб умовах працы ў капальнях, аб прыёме там навічкоў. У галаве Антося варочалася думка: „Стаць вось такім моцным і энэргічным, як гэты прамоўца".

Старшыня сходу стукнуў алоўкам па графіне, заклікаючы прысутных да парадку. Потым запытаў:

— Хто хоча выказацца?

Сход маўчаў.

— Ну, тады хто хоча запісацца на работу ў капальні — запытаў старшыня сходу ў другі раз.

Той вусач, які быў на млыне і прызначыў Махнача дырэктарам, гіранічна ўсьміхаўся. Яго ўхмылка хвалявала Антося. Яму хацелася вось зараз ускочыць на сцэну і расказаць усім пра млын, пра тое, што рабілася ў тую ноч, калі Вусач быў у Махнача.

— Не, тут выкрываць не патрэбна, — падумаў Антось.—Ня

Антось, я вось пра нашых кулакоў напісала ў газэту.

трэба парушаць плянаў Маруські...

З гэтай думкай Антось падняўся з месца і накіраваўся да сцэны. Погляд Антося сустрэўся з поглядам Хвёдара Пятровіча, якому стала не па сабе.

— Еду ў Данбас, запішэце мяне,—папрасіў Антось.

Пасьля Антося падыходзілі маладыя хлопцы і запісваліся на работу ў капальню. Антось запытаў, калі і куды зьявіцца і, задаволены тым, што ён зрабіў пачын, пайшоў дадому. „Ці пахваліць мяне за гэта Маруська", варочалася ў галаве Антося, калі ён падыходзіў дадому.

На млыне Маруські ў гэты вечар ня было. Яна паехала на камсамольскі сход у калгас „Кастрычнік". Антось доўга яшчэ хадзіў па-над рэчкай, да ўсяго прыглядаўся, як быццам ня ўсё яму было знаёма.

Стомлены ад дзеннай хадзьбы Антось прылёг на калёсы, якія стаялі тут-жа каля млыну, і моцна заснуў.

Прачнуўся Антось калі ранішняе сонца пачынала моцна прыпякаць. Ён падняўся з калёс і накіраваўся на мост. Абапёршыся аб парэнчу, ён углядаўся ў ваду, нібы шукаючы там чаго-небудзь. Праходзілі розныя думкі і ўспаміны. Антось прадставіў сябе рабочым-шахцёрам і яму хацелася хутчэй паехаць у Данбас. Ён не заўважыў, як да яго падышла Маруська.

— Здароў Антось—прывіталася Гурава. Антось уздрыгнуў ад нечаканасьці і замест адказу на прывітаньне, ня ведаючы з чаго пачаць сказаў:

— Сёньня я раней за цябе прышоў.

— Я ўчора позна прыехала. Ну, як справы?

— Еду, Маруся.

— Куды-ж гэта?

— У Данбас працаваць — сказаў Антось, пільна ўглядаючыся ў твар Маруські і чакаючы яе рэагаваньня.

— Усё гэта добра, Антось, — крыху падумаўшы сказала Гурава.—Але-ж тут мы яшчэ нічога не зрабілі. З гэтымі тоўстапузымі яшчэ не расквіталіся...

— Тады я пачакаю, не паеду. Я зраблю так, як ты скажаш.

— Так нельга. Калі ты рашыў паехаць, трэба ехаць. Данбасу патрэбны людзі. А калі-ж ты едзеш?

— Сёньня пайду ў раён, а там вячэрнім цягніком...

— А я напісала ліст у рэдакцыю на нашых кулакоў. Адбітак — у райком партыі... Давай прачытаем і каб артыкул быў мацнейшы, падпішыся і ты...

— А гэта нічога, што я беспартыйны?

— Нічога.

Антось, калі артыкул быў прачытан, пасьліній аловак, каб ясьней пісаў, і паставіў сваё прозьвішча пад артыкулам.

— Ну, мне трэба зьбірацца. Зайду яшчэ ў сваю вёску,—гаварыў Антось.

— Пра мяне не забудзеш,— жартаўліва запытала Маруська.

— Ды ніколі, Маруська. Ці-ж можна забыцца...

Антось крыху патаптаўся на месцы, як быццам зьбіраўся ўцякаць і для гэтага рабіў разьбежку. Потым спыніўся і сваімі мутнымі вачыма зьмерыў прыгожую постаць Марусі. Наступіла цяжкая паўза. Маруся адчувала няёмкасьць.

— Ну, бывай, Антось. Пішы, як там устроіўся...

— Маруська... Ты такая адважная... А я вось ня сьмелы, нешта зьбіраюся табе сказаць, але сьмеласьці не хапае...

— Ну, кажы.

— А гневацца ня будзеш?

— Ды не, кажы, Антось.

— Люблю цябе, Маруська... Дазволь цябе пацалаваць на развітаньне...

Маруся не пярэчыла.

Насоўвалася цьмяна-блакітная хмара. У далячыні грымеў гром. Маланка рэзала паветра на два няроўныя кавалкі, буйнымі кроплямі пасыпаў дождж. Маруся і Антось схаваліся пад страхой млыну. Антось са шчасьлівай ухмылкай трымаў Марусю за рукі, углядаўся ў яе чорныя вочы. Сёньня яны здаваліся, як ніколі, прывабнымі і вельмі прыгожымі.

— Маруська, табе і сапраўды ня будзе каму дапамагаць...

— Як ня будзе. Ці-ж мала такіх, як мы з табой. Будзь упэўнен, будзем змагацца з клясавым ворагам, пакуль пераможам. Пераможанымі бальшавікі з фронту не вяртаюцца.

* * *

Перастаў падаць дождж. З-пад хмар выплыла сонца. Пасьля дажджу ўсё павесялела. Смутны толькі быў Антось. Яму цяпер не хацелася пакідаць Марусю і тыя прыродныя прыгожасьці, з якімі так звыкся.

— Ну, да пабачэньня, Маруся.

— Шчасьліва даехаць.

Яны разышліся. Маруся цьвёрдым крокам па ўсходках падымалася на другі паверх млыну. Антось ня зводзіў вачэй з яе ўпэўненай хады. Калі Маруся схавалася ў млыне, Антось накіраваўся да кватэры Махнача. Ледзь толькі ён пераступіў парог, Махнач падазрона зьмерыў яго сваім хітрым поглядам і запытаў:

— Што табе патрэбна, таварыш Калоднік?

— Па-першае, я табе не таварыш, я пралетарыят. Па-другое, давай мне разьлік. Спадзяюся сустрэцца. Аднятая ад людзей табе вылезе праз бок...

— Чаго ты хвалюешся? Захацеў паехаць, пагаладаць, ну і валяй.

— Брэшаш, гад. Там не галадаюць.

Махнач выплаціў Антосю пэнсію за два месяцы і ён пакінуў млын.

IV

Праз тыдзень пасьля таго, як пакінуў Антось млын, Махначова дачка Ліда ехала ў мястэчка. Бацька ёй даваў наказ:

— Ты ж, Ліда, глядзі. Папрасі, каб яе адсюль забралі. Ты не паказвай сваю гордасьць, ёнжа цябе ня зьесьць...

У хуткім часе пасьля гэтага Маруся Гурава атрымала ліст ад райкому камсамолу, у якім было напісана: „Тэрмінова выехаць у вёску Карзуны ў якасьці загадчыка хаты-чытальні“...

Маруся, хаця-ж і разумела, што ўсё гэта зроблена пры ўдзеле Хвёдара Пятровіча па напросу яго каханкі Ліды і на падставе прадуманага пляну Махнача, аднак падпарадкавацца райкому было неабходна. Яна добра разумела камсамольскую дысцыпліну.

У гэтай вёсцы, куды Марусю насылалі на новую працу, яна нарадзілася, вырасла і цяпер там жыў яе бацька. Гэта была адна з большых вёсак у раёне. Маруся павінна была арганізаваць тут чытальню.

На другі-ж дзень пасьля прыезду, Маруся накіравалася ў раён і там прасіла забясьпечыць чытальню кніжкамі, газэтамі і часопісямі. Ёй абяцалі ўсё ўладзіць і з гэтым яна паехала дадому.

Закіпела работа ў вёсцы. Чытальня была заўсёды перапоўнена. Кожнаму селяніну адказвала на ўсе запытаньні. Праводзіла вялікую работу сярод жанчын. У вёсцы пачыналі гаварыць пра калгасы. Кулакі хрыпелі:

— Маруся наробіць вам справу. Будзеце патыліцы чухаць...

— Вось гэта праўда, — казаў Ціхан Сазанавец — даўней мая баба была, як баба, а зараз чорт, а ня баба. Як толькі зьвечарэе, пакідае хату і сядзіць у Маруські.

Гурава ўпэўнена ішла наперад. А ў хуткім часе ў вёску Карзуны прыехаў упаўнаважаны ад раёну. Хлапчукі бегалі па падваконьні і загадвалі на сход. Сход быў назначан у хаце Ціхана Сазанаўца. Сяляне павольна зьбіраліся. Прышла на сход і Маруся Гурава. На парозе яна спынілася, нібы ня ў тую хату трапіла, у якую зьбіралася.

У куце пад „пра сьвятой тройцай“ сядзеў Фёдар Пятровіч. Уся хата гудзела рознымі галасамі. Урэшце клінаватая галава Фёдара Пятровіча падперла самыя абразы. Член сельсавету Нічыпар Умецкі заклікаў сход да парадку, а калі галасы сьціхлі, ён сказаў;

— Нацца, сход будзем лічыць адчыненым. Супроць ня будзе. На парадку дня пытаньне пра калгасы і другое—бягучыя справы. Па-першым пытаньні мае слова вось гэты таварыш — ён ткнуў пальцам у Фёдара Пятровіча Хрыпача.

— Таварышы! Я доўга гаварыць ня буду. Ваша вёска павінна арганізавацца ў калгас. Раз партыя кажа, што праз калгасы можна пабудаваць лепшае жыць-

Гэты дакумант, вось гэты гад у нашай хаце тады згубіў.

цё, значыць яна мае рацыю. Хто будзе перашкаджаць калектывізацыі, таго мы адправім у Салаўкі... Вось сьпіс і падходзьце запісвайцеся. Ну вось і ўсё...

— У каго ёсьць пытаньне — запытаў старшыня сходу.

— У мяне ёсьць,—сказала Куліна Сазанавец.

— Калі ласка.

— Вось, калі мы пойдзем у калгас, Руднянскі млын будзе нашым.

— Ну зразумела, нашым. Я-ж уступаю ў калгас—гаварыў Махнач, Стась Цьвікоўскі махаў галавой у знак згоды.

— Хто хоча выказацца?

— Дазвольце мне—папрасіла слова Маруся Гурава.

— Мне здаецца, што дакладчыка ніхто не зразумеў, бо ён забыўся дабавіць маленькую дробязь: каго гэта ён зьбіраецца пасылаць у Салаўкі? Але не пра гэта цяпер. Я вось хачу сказаць наконт таго, што і Махнач зьбіраецца да нас у калгас. Зразумела, мы ў калгас пойдзем, але вось такім, як Махнач і Цьвікоўскі, у калгасе няма месца... Таварышы, Ленін гаварыў, што так жыць, як жылі раней, нельга. Трэба будаваць новае жыцьцё, а калгас і ёсьць той шлях па якому мы і пойдзем да новага жыцьця...

— Правільна, Маруська!—крычалі жанчыны. Параска Ўмецкая падышла да стала і голасна, нібы зьбіраючыся плакаць, пачала гаварыць:

— Мае вы людцы. Гляджу я дый думаю, што тут будзе. Вы памятаеце, як да нас наляцелі палякі, чалавек мой быў у Чырвонай арміі тады.

Фёдар Пятровіч ня мог усесьці за сталом. Нарэшце, ён ускочыў, як быццам укусіла яго што, і закрычаў:

— Грамадзянка, гаварэце па сутнасьці справы...

— Па сутнасьці? Я ня буду вока туліць — скажу і па сутнасьці. Дык вось, як наляцелі паны, нібы тыя крумкачы, ды давай мяне лупцаваць за тое, што чалавек мой у чырвоных служыў. Мае-ж вы людцы, думала ня вытрымаю. А сёньня гляджу вось на гэтага вусатага—яна ткнула пальцам у Фёдара Пятровіча—і пазнала, ён мяне лупцаваў. Яго тут звалі Трапач (Хрыпач), яго прозьвішча тады было Стасевіч. Я-ж яго пазнала. Але, каб не памыліцца, забегла дадому і ўзяла вось гэту картку.—Параска паказала дакумант з фатаграфічнай карткай.—Гэты дакумант вось гэты Вусач у нашай хаце тады згубіў...

... — Арыштаваць яе,—закрычаў ва ўсю глотку Фёдар Пятровіч.

— А па-мойму цябе трэба арыштаваць разам з тваімі сябрамі,—сказала Маруся Гурава,—пераначуй, панок, тут. Няхай начуюць тут Махнач і Цьвікоўскі. Заўтра мы даставім вас у раён.

Арыштаваных адвялі ў хатучытальню і паставілі вартавых. У гэтую ноч вёска ня спала. Маруська з членам сельсавету Ўмецкім Нічыпарам тлумачылі аб значэньні калектыўнай апрацоўкі зямлі.

У гэтую ноч 32 гаспадаркі беднякоў і сераднякоў згадзіліся працаваць калектыўна. Раніцою сонца чырваньню прыгожыла сялянскія хаткі. Арыштаваных павезьлі ў раён. У кішэні вясковага выканаўцы быў дакумант на імя Стасевіча Браніслава Бэнэдыктава—паручніка першага ўланскага палка.

Па ранейшаму шумеў лес. Пенілася рэчка і вадаспады. Маруська Гурава тлумачыла сялянам.

— У Махнача была папойка. Пад маркай камуніста прыяджаў былы польскі афіцэр якога мы выкрылі. Вось тут на гэтым бервяне сядзеў Калоднік Антось, а вось там за рогам млыну стаяла я. Мы згаварыліся збожжа ахоўваць. У гэтую-ж ноч мы выкрылі клясавага ворага, які хаваў ад дзяржавы збожжа...

Да фурманак няўпэўненай хадой ішла Ліда. Яна заўважыла Маруську, спынілася нібы на беразе рэчкі, якую не магла пераскочыць.

— Здарова, Ліда—прывіталася Маруська.

— Павошта едзеце—нібы спужаўшыся, спытала Ліда.

— Па збожжа, якое закапана ў „Пераворы".

Ліда павярнулася, не сказаўшы ні слова, і пашла да хаты. Ёй ўздагон Маруська крыкнула:

— Не забудзь бацьку і Цьвікоўскаму хлеба занесьці. Яны ў Башавічах сядзяць арыштаванымі разам з тваім каханкам...

— Адыгралася чарната, пачакайце, — пагражала Ліда, махаючы кулакамі ў паветры.

— Ну, паехалі — пазвала Гурава сялян, і дзесяць фурманак рушыліся ў „Пераворы". Каля таго месца, дзе было закапана збожжа, фурманкі спыніліся. Сюды неўзабаве прышлі і сыны Цьвікоўскага на чале з Лідай. Старэйшы сын Уладзік падышоў да Маруські і са злосьцю, з дрыжэньнем у голасе запытаў:

— Вы гэта збожжа тут палажылі.

— Так, мы. Нашы фунты, — адказала Маруська і сама павярнулася ў другі бок. Высока над галавой Маруські ўзьнялася рука Уладзіка і цяжкая рука апусьцілася на галаву дзяўчыны. Уладзік не пасьпеў агледзецца, як на яго навалілася некалькі цел вяскоўцаў. Ня ўцёк і Эдзік з Лідай. У кішэні Уладзіка быў знойдзен рэвальвэр.

Маруська ўсё яшчэ не магла падняцца. Зьвінела ўвушшу ад моцнага ўдару. Потым закіпела работа, выбіралі з ям збожжа. Як мяшкі на млыне, ляжалі скручаныя лейцамі кулацкія сыны.

... Вечарэла. Абоз са збожжам і арыштаванымі накіраваўся па шляху ў раённы цэнтр...

Адыгралася чарната, пачакайце!

ПЕРАТВОРЫМ БССР У ТАРФЯНЫ ДАНБАС

Сваячасова рыхтавацца да тарфянога сэзону

Адным з асноўных відаў апалу для БССР зьяўляецца торф. Тарфяныя нетры Савецкай Беларусі—вялізарнейшыя багацьці нашай краіны. І зусім невыпадкова XIV зьезд КП(б)Б адзначыў, што „поўнае выкананьне плянаў па торфаздабычы ў 1932 годзе—цэнтральная задача ўсёй КП(б)Б—гэта задача шчыльна зьвязана і выцякае з задач выкананьня пляну народнай гаспадаркі БССР у цэлым".

Торф рушыць такія індустрыяльныя крыніцы, як Белдрэс, ад работы якое залежыць выкананьне плянаў прамысловасьці Віцебскага, Магілеўскага і Аршанскага раёнаў, Добруская папяровая фабрыка, „Чырвоная Бярэзіна" і інш. У 1933 годзе мы павінны перавесьці ўсю прамысловасьць Савецкай Беларусі на тарфяны апал, і таму задача выкананьня плянаў торфаздабычы гэтага году зьяўляецца рашаючай для ўсёй прамысловасьці.

У мінулым годзе мы ня выканалі плянаў торфаздабычы. Гэта тлумачыцца тым, што на торфазаводах і ў кіруючых торфарганізацыях 6 гістарычных умоў тав. Сталіна ня сталі асноўнымі ў рабоце. Торфазаводы ня здолелі перабудаваць сваёй работы і кіраўніцтва па-новаму, ня здолелі сваячасова падрыхтаваць мэханізмы, рабочую сілу і ўсе ўмовы для пасьпяховага выкананьня плянаў. Вось асноўныя прычыны прарыву мінулага году.

Сёлета па БССР мы павінны здабыць каля мільёна тон торфу. Гэта надзвычай сур'ёзная і адказная задача будзе выканана толькі пры ўмове, калі будзе сваячасова праведзена падрыхтоўчая праца да сэзону і рабочыя і работніцы пад кіраўніцтвам нашай партыі мабілізуюць свае сілы на выкананьне намечаных плянаў.

Торфсэзон пачынаецца 5-га мая. Зараз асноўнай задачай у падрыхтоўцы да яго зьяўляецца арганізаваны набор рабочай сілы, у асаблівасьці набор жанчын для работы на торфазаводах. Калі ў мінулым годзе ў тарфяной прамысловасьці працавала каля 3.500 жанчын, то ў гэтым годзе павінна працаваць 5.388 жанчын, што складае каля 50 пр. усёй рабочай сілы на торфазаводах.

Жаночая сіла ў большасьці скарыстоўваецца ў цэхах сушкі і зьяўляецца аднэй з адказьнейшых работ, якая вырашае лёс якасьці торфу. Таму патрэбна асабліва сур'ёзную ўвагу зьвярнуць на набор жанчын на торфазаводы. Узброіць іх тэхнікай тарфяной справы, давесьці да кожнай з іх значэньне торфу ў соцыялістычнай прамысловасьці БССР—вось баявая задача. Патрэбна ўжо зараз паклапаціцца аб стварэньні адпаведнай колькасьці дзіцячых ясьляй і садоў, тым больш, што ў гэтым годзе адпушчаны значныя сродкі на іх арганізацыю.

Другой важнейшай задачай у падрыхтоўцы да сэзону зьяўляецца рамонт і асваеньне новых мэханізмаў. Патрэбна заняцца пытаньнем скарыстаньня жаночай сілы на так званай „мужчынскай" рабоце. Вопыт мінулага году паказаў, што жанчыны здольны працаваць на любым вучастку торфазаводу. Так, брыгада Кароўкінай на заводзе „Бальшавік" у мінулым годзе працавала на транспартэры. Кароўкіна ўнесла прапанову, каб скараціць колькасьць чалавек у брыгадзе з 16 да 12 пры захаваньні нормы выпрацоўкі, і брыгада з работай справілася. Патрэбна ў гэтым годзе памножыць вопыт Кароўкінай у дзесяткі і сотні раз.

Жанчына—тарфяніца, трактарыстка, матарыстка параўшчыца, дзесятнік і інш.—павінна заняць пачэснае месца ў рабоце тарфяной прамысловасьці. І гэта бязумоўна дапаможа нам выканаць дырэктывы партыі па торфапрамысловасьці.

Жанчыны ў гэтым годзе будуць займаць значнае месца ў выкананьні плянаў, таму яны павінны зьявіцца галоўным атрадам у барацьбе за разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, за ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна, за вывучэньне тэхнікі тарфяной справы, за наладжаньне культурна-бытавой работы на торфазаводзе.

Барацьба за чысты ложак, за чыстую бялізну, за культурны барак, за сацыялістычную сталоўку—супроць бруду, клапоў, пахабшчыны—адна з галоўнейшых задач.

Такім чынам, у гэтым годзе асабліва сур'ёзныя задачы па выкананьні плянаў торфаздабычы патрабуюць ад усіх партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і савецкіх арганізацый напружанай работы на ўсіх вучастках торфазаводаў на барацьбе за выкананьне плянаў, у гэтым жанчына павінна адыграць адну з рашаючых роляй.

Э. Каганская.

Тэма III. Асноўная апрацоўка глебы пад тэхнічныя культуры

Лепшым часам для заворваньня глебы пад лён зьяўляецца восень. Гэта ворыва завецца зяблівам. Асеньняе ворыва зьяўляецца лепшым таму, што да пасеву ільну ў глебе, дзякуючы доступу паветра, перагніває шмат матэрый, ад чаго ствараецца шмат спажыўных матэрый, якія неабходны для росту ільну. Адначасова з раскладам арганічных матэрый адбываецца ператварэньне цяжка раствараль ных матэрый у даступную форму для расьлін.

Ад тых вынікаў, якія атрыманы вопытнымі станцыямі, відаць, што пасеяны лён на глебах, зараных увосень, даваў прыбаўку да 25 проц. ураджаю больш у параўнаньні з тым ураджаем, які быў атрыман на тэй-жа глебе, але толькі ня ўзоранай з восені. Вось таму правядзеньне асеньняга ворыва глебы пад лён адыгрывае вялікую ролю ў справе павышэньня ўраджайнасьці тэхнічных культур—ільну.

Па-другое, асеньняе ворыва больш зручнае тым, што праходзіць не ў такі напружаны час, як вясною, калі патрабуецца шмат рабочай сілы на выкананьне іншых работ. Асеньняе ворыва павінна заканчвацца да наступленьня марозаў. Тарфяныя глебы пад тэхнічныя культуры абавязкова павінны ўзорвацца з восені.

Пры распрацоўцы новых земляў лепш ворыва праводзіць пасьля пасеўнай веснавой кампаніі на працягу ўсяго лета і восені. Такое ворыва дасьць магчымасьць хутчэй разлажыцца арганічным матэрыям і гэтым самым стварыць добрыя ўмовы для росту тэхнічных культур. Адначасова з правядзеньнем асеньняга ворыва вялікую ролю адыгрывае таксама і глыбіня ворыва. Глыбіня ворыва на падзолістых глебах не павінна быць больш 15 сант. Пры ворыве падзолістых глебаў трэба, каб на паверхню пласта не папаў падзол, бо гэта будзе адбівацца на ўраджаі ільну. Пасьля правядзеньня вясеньняга ворыва глеба застаецца да вясны. Раньняй вясной, калі можна будзе выехаць у поле, трэба забаранаваць глебу, зараную з восені. Баранаваньне праводзіцца бараною „Зігзаг". Потым робіцца ўжо канчатковая апрацоўка глебы дыскаваю бараною або лушчыльнікам на глыбіню 6—8 *см.* На мяккіх глебах, дзе добра разлажылася дзярніна, апрацоўку глебы лепш праводзіць дыскаваю бараною ці лушчыльнікам, а на глебах задзірванелых лепш ужываць дыскавую барану. На задзірванелых глебах дыскавая барана не выкідае на паверхню глебы дзярніны.

Тэма IV. Угнаеньне глебы пад тэхнічныя культуры

Задача кожнага калгасу і саўгасу—атрымаць як мага большы ўраджай. Дабіцца добрага ўраджаю мы зможам праз добры севазварот, добрую апрацоўку глебы, пасеў добраякасным насеньнем, правядзеньнем барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі, а таксама і праз унясеньне мінэральных угнаеньняў. Рост кожнай расьліны залежыць ад глебы, паветра, вады і сьвятла. Расьліны, як і чалавек, жывяцца і дыхаюць. Для дыханьня расьлінам патрэбна паветра, а для жыўленьня—спажыўныя матэрыі. Толькі пры дастатку матэрый, паветра, вады і сьвятла расьліна можа нармальна разьвівацца і даваць добры ўраджай. Для нармальнага росту расьліны патрэбны наступныя матэрыі: кісларод, вадарод, вуглярод, азот, фосфар, калі, натры, жалеза, кальцы, магні, серка і крэмні. Сама расьліна складаецца з вугляводаў, вады, крухмала, клятчаткі, бялковых матэрый, і розных кіслот. У склад кожнай матэрыі ўваходзяць і вышэй адзначаныя матэрыі.

Адкуль бяруць расьліны спажыўныя матэрыі? Для дыханьня расьліны спажыўныя матэрыі бяруць з паветра. З паветра расьліны бяруць кісларод і вуглярод. Кісларод расьліны бяруць з паветра лісьцямі, сьцяблямі і карэньнямі. Для таго, каб атрымаць вуглярод з паветра, расьліна паглынае вуглякіслы газ, які пападае ў клеткі расьлін, дзе пры дапамозе хлёрафілу і сонечных праменьняў ён распадаецца на дзьве матэрыі—вуглярод і кісларод. Вуглярод разам з матэрыямі ў расьліне складае крухмал. Крухмал утвараецца толькі на сьвятле. Усе іншыя матэрыі расьліны бяруць з глебы пры дапамозе карэньняў. Толькі некаторыя расьліны бяруць з паветра азот пры дапамозе бактэрый, якія жывуць на карэньнях некаторых расьлін. Гэтыя бактэрыі на карэньнях утвараюць клубянькі. Да такіх расьлін адносяцца бабовыя—канюшына, гарох, лубін. А ўсе іншыя азот бяруць з глебы, які знаходзіцца ў выглядзе азотна-кіслых соляў, што завуцца салетраю. Салетра атрымліваецца пры перагніваньні арганічных матэрый, якія, дзякуючы бактэрыям, ператвараюцца ў азотна-кіслыя солі. Калі ў глебе ёсьць шмат перагною, то расьліны ніколі не адчуваюць недахвату ў азоце. Пры недахваце перагною расьліны патрабуюць унясеньня ўгнаеньняў у глебу. Азот грае вялікую ролю ў жыцьці расьліны. Без азоту ні адна расьліна жыць ня можа. Азот уваходзіць у склад складаных матэрый, як бялковых. Бялкі знаходзяцца ў пупышках, маладых сьцяблох, і кончыках карэньняў. Фосфар зьяўляецца таксама аднэй з важных спажыўных матэрый; без яго ні адна расьліна таксама жыць ня можа. Расьліны, асабліва ў маладым узросьце, бяруць шмат фосфару. Таксама шмат фосфару знаходзіцца ў насеньні расьлін. Фосфар у невялікай колькасьці знаходзіцца ў перагної. У часе распаду перагною фосфар вызваляецца і становіцца больш усваяльным для расьлін.

Таксама расьліны ў вялікай колькасьці адчуваюць патрэбу ў калії. Калі знаходзіцца ў тых частках расьлін, дзе ёсьць крухмал. Таму больш за ўсё калія знаходзіцца ў кораньплодах, бульбе, тутуні. Гэтыя расьліны шмат бяруць калія з глебы і патрабуюць унясеньня яго ў вялікай колькасьці ў глебу. Расьліны больш за ўсё адчуваюць патрэбу ў азоце, фосфары і калії. Іншых матэрый у глебе хапае амаль у патрэбнай колькасьці. Па

(Працяг глядзі на 4 стар. вокл.)

Цана асобнага нумару 10 кап.

Парады агранома

ЯК ВЫРАСЬЦІЦЬ РАНЬНЮЮ БУЛЬБУ

Лёгкія глебы Беларусі добра спрыяюць развіццю ранняй бульбы ў больш вялікіх плошчах, чым у іншых частках нашага Саюзу. Бульбу скарыстоўваюць для корму жывёлы, выпрацоўкі крухмалу, а таксама для харчаваньня людзей. У Беларусі да гэтага часу саўгасы, калгасы ў большасьці разводзяць позьнія гатункі бульбы і менш за ўсё раньні гатунак, у той час, калі раньні гатунак бульбы можа надта хутка рэалізавацца, асабліва ў раёнах з буйной прамысловасьцю. Калгасы і саўгасы, якія знаходзяцца каля цэнтраў, павінны на сеяньне гатункаў раньняй бульбы зьвярнуць вялікую ўвагу.

Пры правільным выбары гатунку і пры правільным яго вырошчваньні мы зможам дабіцца ўраджаяў раньняй бульбы ў канцы ліпеня і пачатку жніўня. Лепшымі гатункамі раньняй бульбы ва ўмовах БССР зьяўляецца „Этнур", „Раньняя роза" і „Красуня гэброна"

Пры пасеве гатункаў раньняй бульбы яна павінна высявацца на папарным кліне перад азімым збожжам ці пшаніцаю. Пры такім засеве поле да пачатку жніўня вызваляецца і на ім можа высявацца збожжа азімае, або пшаніца. Раньняя бульба можа быць засеяна і на яравым кліне, але пры такіх умовах пасьля зьняцьця бульбы поле засяваецца вікай з аўсянай мешанінай. Поле, якое прызначаецца для пасеву раньняй бульбы, павінна быць увосень добра і глыбока ўзарана. Вясною гэтае поле зноў узорваюць або добра барануюць. Калі глеба ў калгасе ці саўгасе лёгкая, то пры заворваньні ўвосень такую глебу вясною патрэбна толькі баранаваць.

Лепшым угнаеньнем зьяўляецца гной, які патрэбна ўносіць увосень. Унесены з восені гной пасьпее за гэты час добра разлажыцца і даць патрэбную колькасьць спажыўных матэрый, неабходных для росту раньніх гатункаў бульбы. Не патрэбна вясною ўносіць у глебу неперапрэлы гной пад раньнія гатункі бульбы. Ад неперапрэлага гною бульба хварэе паршою і не дае добрага ўраджаю. Добрыя вынікі для атрыманьня ўраджаяў раньнія гатункі даюць ад унясеньня мінэральных угнаеньняў, асабліва калійных. Калі глеба будзе падрыхтавана як належыць для засеву гатункаў раньняй бульбы, тады трэба падабраць добры насенны матар'ял.

Пры падрыхтоўцы насеннага фонду бульбы патрэбна, каб ён быў перабраны. Гнілыя і дробныя бульбінкі патрэбна выкінуць з насен. фонду. Лепшым насен. фондам бульбы будуць бульбіны велічынёю з курынае яйка. Чым будзе меншая бульбіна, тым яна трымае меншую колькасьць спажыўных матэрый, а раз гэта так, то і расьліна атрымліваецца ня моцнаю і дае меншы ўраджай. Гэта тлумачыцца тым, што расьліна ў першы час жывіцца тымі спажыўнымі матэрыямі, якія ў сабе мае бульбіна. Вельмі буйныя бульбіны не карысна высяваць таму, што для пасадкі на 1 *га* плошчы ідзе вельмі шмат бульбы. Вось чаму бульбіны велічынёю з курынае яйка маюць даволі спажыўных матэрый для таго, каб іх хапіла для вырошчваньня моцнай расьліны. Некаторыя калгасы, саўгасы пры пасеве разразаюць вялікія бульбіны на кавалкі. Гэтага ўсё-ж рабіць ня раіцца. Вось чаму. У нас пры пасадцы бульбы ў глебу раньняй вясною глеба мае шмат вільгаці, ад чаго бульба хутка загніваецца і прападае. Калі-ж сярэдняй бульбы ў калгасе ці саўгасе няма, то тады буйныя бульбіны разрэзваюцца ўдоўж папалам за некалькі дзён да пасеву і кладуцца ў цёплае месца. Ад такога прыгатаваньня бульбы, разрэзаныя месцы пакрываюцца коркамі і гэта ня будзе спрыяць хутчэйшаму загніваньню яе.

Перад пасадкаю раньніх гатункаў бульбы насенфоид за 4—5 тыдняў да пасеву ў цёплым і сьветлым памяшканьні рассыпаецца тонкім пластом. У такіх умовах бульба хутка дае парасткі. Ад сьвятла парасткі ня выцягваюцца, як гэта здараецца ў цёмным памяшканьні, і пры пасадцы ня так ламаюцца. Моцны парастак, які атрымаўся тады, калі памяшканьне мела шмат сьвятла, у глебе дае пучок густых карэньняў, а таксама хутчэй дае лісточкі. Пры такіх умовах хутчэй атрымліваецца ўраджай бульбы. Прарошчваньне насеньня бульбы трэба рабіць тады, калі мяркуецца ўраджай бульбы зьняць як мага раней. Можна бульбу не прарошчваць, а правяльваць. Правяльваньне бульбы робіцца за некалькі дзён да пасеву. Правяльваецца бульба такім чынам: у чыстым, сьветлым і цёплым памяшканьні бульба рассыпаецца тонкім пластом. Пры правяльваньні парасткі толькі пасьпяваюць паказацца. Таксама правяльваньне бульбы спрыяе атрыманьню добрага ўраджаю раньніх гатункаў бульбы. У залежнасьці ад надвор'я бульбу сеюць звычайна ў пачатку мая. На глебах лёгкіх пасадку раньніх гатункаў бульбы лепш рабіць пад плуг. Бульба ў баразьне кладзецца блізка каля боку парасткамі ўгору. Такая пасадка бульбы дае магчымасьць парасткам хутчэй выбіцца праз глебу. Таксама бульбу можна сеяць пад мэркер з заворваньнем плугам пад баранаваньне.

А. М.

Угнаеньне глебы пад тэхнічныя культуры

(Працяг)

даных Маскоўскай ільняной вопытнай станцыі сярэдні ўраджай ільну з 1 *га* плошчы бярэ наступную колькасьць угнаеньняў: азоту ня менш 45 кгр., у той час, калі збожжавыя—30—37 *кгр.*, калія—ня менш 45 *кгр.*, збожжавыя—каля 28 *кгр*; фосфарнай кіслаты—каля 30 кгр., збожжавыя—15—19 *кгр.*, вапны—каля 33 кгр. збожжавыя—каля 11 *кгр.* Таму лён патрабуе ўнясеньня больш спажыўных матэрый, чым іншыя расьліны. Для ліквідацыі недахвату спажыўных матэрый мы павінны кожны год уносіць іх у глебу. Поўныя мінэральныя ўгнаеньні маюць усе спажыўныя матэрыі. Аб гэтым мы будзем гаварыць у наступнай гутарцы.

Аграном Маркавец.

Літаратура: Аграправілы для брыгадзіраў ільнаводчых калгасаў і саўгасаў.

Выданьне ЦК КП(б)Б Рэдактар Э. ШАПІРА

Друкарня імя Сталіна Заказ № 873 У ліку 16.700 экз. Ул. Галоўлітбелу № 3—4